Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ.



НАША СЛОВА.pdf

Пяты год выдання **№ 30 (239) 25 лістапада 2026 г.**

Лідскія тэатральныя сустрэчы

21 лістапада ў Палацы культуры горада Ліды прайшоў XIV абласны фестываль народных тэатральных калектываў "Лідскія тэатральныя сустрэчы".

Тэатральны марафон прайшоў на высокім арганізацыйным і мастацкім узроўні, сабраўшы вядучыя аматарскія калектывы Гарадзеншчыны і ганаровых гасцей з Берасцейскай вобласці.

- Праграма форуму вызначалася жанравай разнастайнасцю і глыбінёй сцэнічных рашэнняў. На працягу фестывальнага дня гледачы і журы ўбачылі пастаноўкі самых розных напрамкаў: ад традыцыйнага лялечнага мастацтва і бессмяротнай класікі да вострай сатыры, псіхалагічнай драмы і музычна-драматычных эксперыментаў. Кожны калектыў прадэманстраваў уласны творчы почырк, акцёрскае майстэрства і адданасць сцэне, - расказалі нашай рэдакцыі ва ўстанове.



Па выніках конкурсных праглядаў журы вызначыла лепшых з лепшых.

Галоўныя лаўрэаты фестывалю:

Дыпломам I ступені ўзнагароджаны народны лялечны тэатр "Батлейка" аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (кіраўнік - Ірына Іванаўна Вашкевіч).

Дыпломам II ступені адзначаны народны тэатральны калектыў "Магія гульні" ДУК "Бераставіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (кіраўнік - Аляксандра Іванаўна Каравай).

Дыплом III ступені заваяваў народны тэатральны калектыў "СМОЛТ" ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" (кіраўнік - Вольга Мікалаеўна Сямёнава).

Уладальнікі спецыяльных прызоў:

"За найлепшую рэжысуру" - народны драматычны тэатр "Ракурс" ДУ "Палац культуры горада Ліды" (кіраўнік - Ірына Мікалаеўна Сільчанка).





"За найлепшую жаночую ролю" - народны тэатр "Памфлет" ДУК "Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" (кіраўнік - Аляксей Ігаравіч Лукша).

"За найлепшую мужчынскую ролю" - народны драматычны тэатр ДУК "Ашмянскі раённы цэнтр культуры" (кіраўнік - Наталля Мікалаеўна Гардзей).

"За найлепшы акцёрскі ансамбль" - народны маладзёжны музычна-драматычны тэатр "Гарадзенская надзея" ДУ "Гарадзенскі гарадскі цэнтр культуры" (кіраўнік - Алег Аляксандравіч Саладуха).

Дыпломам за ўдзел у фестывалі арганізатары адзначылі ганаровага госця - народны тэатральны калектыў "Дом Дыягена" філіяла "Гарадскі Дом культуры" ДУК "Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная клубная сістэма" Берасцейскай вобласці (кіраўнік - Арцём Міхайлавіч Бодак).

Фестываль яшчэ раз пацвердзіў статус важнай культурнай пляцоўкі рэгіёна, падарыўшы ўдзельнікам каштоўны прафесійны вопыт, а гледачам - яркія сустрэчы з тэатральным мастацтвам.

Служба інфармацыі "КіМ".

pawet.net



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА.pdf

Зміцер Захарэвіч

ПАД ШОМАСТ КЛЁНАЎ

КАРАЛЕВА БАЛЮ

Пакіньце ўрэшце ложкі каханак,
Зайграйце туш на раялі! -
Я сёння з ласкі лёсу абраны
На трон каралевы балю.

Спавеце ў шоўк акружыны талій
У радаснай эйфарыі,
Якой не ведаў тлум сатурналій,
Тым больш - карнавалы Рыё.

На кпіны ў адказ брудна ўсміхнуся,
Згубіўшы сорам і меру.
Натхнёны траўнем фатам зраблюся,
Бо годзе пэцкаць паперу!

Пад вохі паняў па кожным пляцы
Пракрочу ўладна-спакусны,
Знарок неўтаймаваным паяцам
Зруйную эстэтаў густы.

У гонар мяне горад аслепяць
Уноч салютаў каралі…
Дальбог, няма лепш долі на свеце,
Чым быць каралевай балю!

ДЫМ (ЖНІВЕНЬ)

Курэе ў пальцах цыгарэта.
Сутонне. Дождж змывае лета.
І што ўяўлялася магчымым
У невараць знікае дымам.

З надвор'ем зменлівым у згодзе
Гады ідуць, сябры сыходзяць,
За фатаздымкам фатаздымак
З калажу дзён знікаюць дымам.

А досвед неабвержна сведчыць -
Нішто пад месяцам не вечна,
І пані з зорнымі вачыма
Знікае з успамінаў дымам.

Не плача серп па сцятай ніве -
Жнуць жыта, і праз тое жнівень



Усцяж апанаваны сплінам,
Бо ў хуткім часе знікне дымам.

І ў шыбіну скрабуцца кроплі,
І попел на асфальце мокне,
І над струменямі касымі
Нябёсы ў хмарах, нібы ў дыме.

ВЫБАР І ЦАНА

Хоць выплач у роспачы вочы ?
Спрадвечны закон не змяніць:
За зроблены выбар аднойчы
Дарэшты прымусяць сплаціць.

Тым, што пагарджалі баяцца,
Абвесціў цану прыгавор:
Пятля на Лукішкаўскім пляцы
Альбо ў Старым Мясце касцёр[1].

[1] Першая згадка пра паўстанца, павешанага на Лукішкаўскім пляцы ў Вільні ў 1864 г.
Другая - пра філосафа Казіміра Лышчынскага (з Берасцейшчыны), якога спалілі разам з ягонай кнігай "Пра неіснаванне бога" ў Старым Мясце Варшавы ў 1689 г.

Усе, хто ў пакоры гнуў плечы
Прад ліхам панылым трысцём,
Жыць хочучы "па-чалавечы",
Без следу сышлі ў забыццё.

Згараць, набліжаючы ранне,
Ці знікнуць у цемры густой ?
Два розныя наканаванні,
А выбар - заўжды за табой.

Таму ні скуголь, ні маліся ?
Спрадвечны закон не змяніць:
За тое, жывеш чым, калісці
Даводзіцца ўрэшце плаціць.

ПРЭЧ З ПРЭНГУ

Прачнуцца на досвітку
й слодычы сноў не даць веры…
Разбіўшы душу да крыві аб адчаю глыжы,
Глядзець з-пад ілба
на абшар, нібы попел сшарэлы,
Калі на кроплевірус хворае неба імжыць.

Выпальваць жыццё
без жальбы, без слёз, без астачы,
Сілкуючы вогнішча, дровы падкладваць штораз,
Самоту трываць,
каб не здолеў ніхто перайначыць
Усё, чым натхнёны, і пломень урэшце не згас.

Уладна ўтаймоўваць
бясплённую сэрца мінтрэнгу
Пакуль яго голас чуваць на дарогах зямных…
Так праўду сваю
вызваляю, здымаючы з прэнгу
Ідэяў прывабных, але недасяжна чужых.

КРЫЖ ПРЫ ДАРОЗЕ

Ён - не канец і не пачатак,
А толькі напамін спрамеж,
Дзе час знікомы ёсць аплатай
За тое, што яшчэ ідзеш.

Бадзяга, беспрытуллем гнаны
З нягод у новы неспакой,
Нясеш спадзеваў і заганаў
Цяжар нязбытны за спіной.

Каб у няпэўнасці не змогся,
Ляжыць падказкай на шляху
Адбітак кроку Маткі Боскай
Пад промнем на следавіку[2].

Не ўзрушыш поступам тутэйшых
Ні сон, ні плёткі за плячмі,
Бо ім вядома - ты не першы,
Хто выправіўся ў далячынь.

Хвастаюць сцюжа альбо вецер,
Але без выбару брыдзеш
Даць рады прыкрай паняверцы
І сціжме вусцішных відзеж.

Няхай зласліўцы дол прарочаць -
Ні дробкі праўды ў іх, калі
Крыж пры дарозе рыхтык ростань
Безмежных неба і зямлі.

ЦЯПЕЛЬЦА

Прад прыйсцем хмарных маразоў
Цяпельца свірстуном трапеча,
Трывожна хутаючы плечы
У сцёблы чэзлых верасоў.

Нібыта трапіўшы ў сіло,
Не можа ўзняцца да сінечы,
Дзе спее бесстаронне вечар,
Навокал гасячы святло.

На ростані кладзецца змрок,
Згрынае пашчаю мярэчы
Пачуцці, краявіды, рэчы,
І ў прышласць не знайсці дарог.

Але струменіцца дымок
У непраглядную вышэчу,
Каб паязджане скрозь цямрэчу
Цяпельца бачылі здалёк.

РАНІШНІЯ ЗАЦЕМКІ

Нябёсы колераў вясны
На старце бабінага лета.
Я па-за ўдзелам у гульні,
Што, зрэшты, звыкла
Для паэта.

Намэціў светач сабе шлях:
У высь птушыную да поўдня -
Ад нас чым далей.
Справы швах
Люструе нема шыбаў роўнядзь.

Нібыта ранішняя стынь,
Кастроў са змеценага лісця
У сэрцы пустку поўніць дым

[2] Следавік - гэта тып сакральных камянёў, на паверхні якіх ёсць паглыбленні, што сваёй формай нагадваюць адбіткі чалавечых ног (босых або ў абутку) ці рук. Многія з гэтых паглыбленняў у народзе называлі "След Маткі Боскай".



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА.pdf

На час,
Знікаючы з вятрыскам.

Сцішаецца міжволі кроў
Праз колабег пабляклых датаў,
Не вабяць зместам мінакоў
Афішы
Паркавых тэатраў.

Да скону блізіцца сезон,
Хоць рэквізіт пакуль на вербах,
Ды агаляе іх агонь,
Заняўшыся на вецці
Й нервах.

КАНЕЦ БАБІНАГА ЛЕТА

Ледзь чутна рыпнулі масніцы -
Не папытаўшыся, у дом,
Дыхнуўшы водарам ігліцы
І спорным ранішнім дажджом,
Зайшла. Паставіла гасцінцы
На стол, згалелы без яе, -
Зялёнак кошык, гляк брусніцаў,
Слівянкі промністай бутэль.

Нібыта вогнішча, рудая
З трапёткай, палкаю душой,
Якая смутак спапяляе
І немач зводзіць на нішто.
Калі ж трывогу разварушыць
Нягод падступных насланнё,
Заместа граю зніклых птушак
Яна суцешыць цішынёй.

Дык сустракай, паэце, пані! -
Такія госці не да ўсіх
На двор завітваюць світаннем
Пад шомаст клёнаў залатых.
Але ў час шчырае гаворкі
Не расхвалюй яе нічым,
Бо зарыдае Восень горка
Аб леце бабіным сваім.

ПЕРШАГА КАСТРЫЧНІКА Ў ЯБЛЫНЕВЫМ САДЗЕ

Кастрычнік ветла расчыніў
У сад агністы дзверы,
Як у тэатр, і запрасіў
З'явіцца на прэм'еру.

Хоць п'есе тысячы гадоў,
Я даў рудому веры,
Бо вабіў чырванню пладоў
З раскошы інтэр'еру.

Цяпер свавольнік і дзівак
Шчыруе ў ім з намерам
Натрэсці на віно пляцак
І трошкі на вячэру.

ШЛЯХ ВІРАВАННЯ

"…І на шлях віравання вяртаецца вецер".
Кніга Эклезіяста 1:6

Пэўна, аслеп
І дарогаю схібіў,
Вецер няўсцерп
Б'ецца роспачна ў шыбы.

Па-над дваром
З енкам птушкай кружляе,
Побач - варон
Чарнакрылая зграя.

І не заснуць -
Сны нязводнай трывогай
Ён ахінуў,
Як ляцеў над парогам.

Часам гарун,
Не знаходзячы выйсця,
Кіне ўгару
Жменю ржавага лісця.

Ці загудзе
Між настылых таполяў -
Вышу пратне,
Ноч напоўніўшы болем.

Страціў маршрут?
Шанс згубіў на вяртанне? -
Што, калі тут
Шлях яго віравання?

Гэтак і мы:
На пляцах, па вандолах,
Рыхтык сляпы,
Робім кола за колам -

Прагнем знайсці
Сэнс свайго прызначэння…
Вецер жа сціх
Праз бясплённасць кружэння.

СУЦЯШЭННЕ

Неба навальнічна
Хмарыць далягляд.
Стаўшы безаблічным,
Спіць счарнелы сад.

Немач і дрымота
Рэй вядуць наўкол.
Прэлая лістота
Скрозь услала дол.

Склаў пакорна крылы
Мёртвы матылёк.
Цягнецца ў панылы
Краявід дымок.

Кволае цяпельца -
Дробка цеплыні.
Вочы, рыхтык шкельцы,
Бліснуць пры агні.

Нібы суцяшэнне,
Што яшчэ не згас.
Восеньскі лішэнец
Баўлю лішні час.

Кемны, кплівы, кляты
Я палю адчай.
Будзе і ў нас свята,
Толькі прычакай.

СТРАТА

Бывай, яшчэ адно жыццё, -
Завершаны кастрычнік.
Але жалобы пачуццё
Не змрочыць мне аблічча.

Учора ў невараць лістком
Зляцеў агністы месяц,
І золкія вятры паўднём
Прысадамі гарэзяць.

Не ведаюць няўрымсты слёз -
Не страшыць страта дужых
Ні прывідам пустых нябёс,
Ні прыйсцем блізкім сцюжы.

А значыць - шкадаваць дарма,
Не мучу смуткам сэрца,
Што ўжо каля дзвярэй зіма,
Бо і яна мінецца.

А ЎСЁ Ж…

Пабляклым сонцам
Ганак ледзь сагрэты -

Прамень нямоглы
Чэзне ля дзвярэй;

Пустыя дні,
Празрыстае паветра -

Ушчэнт згалелі
Ліпы на дварэ.

Маўчаць нябёсы,
Бы асірацелі, -

Аціх залівісты
Птушыны грай,

Паштоўкі віншавальныя
Зжаўцелі,

Сацмеўшы, сцяўся
У маркоце гай.

Губляе год
Няхітрыя нажыткі,

Сыходзячы няўхільна
Пакрысе,

А ўсё ж
Яшчэ рудзеюць аксаміткі

І выкупацца
Хочацца ў расе.

МЕДЗЯКІ СУЗОР'Я

Пры кроку кожным у кішэні
Звіняць, як бомы, медзякі
Сузор'я, схопленага ў жменю
Па ўзмаху дзёрзкае рукі.

Над пусткаю льняное спальні,
Дзе толькі заціш і сутонь,
Між хмар зіхцелі спакушальна,
Нібы прасіліся ў далонь.

Не ў змозе ўяве супярэчыць,
Не ў скарбніцу, а для душы,
Згарнуў апоўначы з цямрэчы
Свавольна зорак кругляшы.

Бадай, прад вышай вінаваты,
Ды выпраўдацца ёсць спадзеў,
Бо праз нязначнасць сваёй страты
Сусвет ні трохі не збяднеў.

І хоць за дробязь не набуду
Ні выпіўку, ні маладосць,
Я цешуся блішчастым цудам -
Паўтузінам манет з нябёс.

ЯСАКАР І ВЕЦЕР

На дзве траціны каляндар
Паменшаў з навагодняй ночы,
І скрушна ветру ясакар
Пра жнівень скончаны шапоча,
Пра кветкі, што наўкол цвілі,
Пра сённяшнюю адзіноту,
А вецер бавіцца ў галлі,
На дол шпурляючы лістоту.

Схіліўшы скорана чало
Праз боль няўмольнага растання,
Аб птушках, леглых на крыло,
Аб тым, чаго вярнуць не ў стане,
Аб леце, стлелым без астач,
Жальбуе ясакар нязмоўчна,
Дарма - гарэзлівы слухач
Нібыта ўчуць яго не хоча.

ВУГЕЛЬЧЫК

Мінучасць прыжданага плёну,
Уяўных удач сумятня.
Апушчана змроку заслона
Над попелам стлелага дня.

Вярбы абламанае вецце,
Няспеласць апалых пладоў.
Няспраўджаных мрой не зацепліш
Пагаслае вогнішча зноў.

Набрузлі начной золлю жылы,
Здранцвеннем спавіла цямрэч.
Няможна над прыскам астылым
Ні рукі, ні сэрца сагрэць.

Вятры спрэс ад дыму прагорклі,
Аднак між чарноцця ўгары
Вугельчык Палярнае зоркі
Астачай надзеі гарыць.

РАНДЭЛЬ ПА ШПАЦЫРЫ

Брыдзе скрозь паркі лістапад,
Рыззём лістоты ледзь прыкрыты,
Без сонечнага аксаміту
Пакроваў і парчы Каляд.

Туманам сцеліцца пагляд,
Вятроў прыцішаныя рытмы -
Брыдзе скрозь паркі лістапад,
Рыззём лістоты ледзь прыкрыты.

Не азіраецца назад,
Рахункі звёўшы з перажытым
З усмешкай сумнай аб нязбытным,
Няспешна, рыхтык самастрат[3],
Брыдзе скрозь паркі лістапад.

МУЗЫКА

Гэта музыка - плёскат мора,
Што ў свет выправіла караблі,
Вогкі подых першых разораў
На абуджанай плугам зямлі.

Гэта музыка - трэск ігліцы
Ля прылеску ў паходным кастры,
Клекатанне статнай буслiцы
Скрозь стагоддзі на крэўскім муры.

Гэта музыка - шэпт старонак
Кніжных з купаю чарнавікоў,
Глухі выбух дальняга грому
За шкляной запавесай дажджоў.

Гэта музыка срэбным скерца
І ў дзень ясны, і ў хмарнай начы
Увушшу, у згадках, у сэрцы -
Ува мне несціхана гучыць.

* * *

Няспешна караблі аблокаў
Плылі над соннаю зямлёй,
Усход глядзеў барвовым вокам,
Як драпала барты галлё.

А з вокнам невідочных ранаў,
Каб прыкры заспакоіць боль,
На горад, схутаны туманам,
Лілася ранішняя золь.

Імжы калючай пацяруха,
Нібыта на пусты прычал,
Мне клалася на сэрца скрухай
Пад мокрым ветразем плашча.

Шарэла непагодным морам
Бяздонне смужнае нябёс,
Але ўжо з вогкае прасторы,
Яснеючы, дзень новы рос.

* * *

Знішчае час
Цвярдыні і святыні,

Да слёз і грозьбаў
Велічна глухі.

Надыдзе дзень,
І мой агмень астыне,

Зрабіць паспеўшы
Попелам радкі.

І скардзіцца,
І шкадаваць дарэмна -

Час бесстаронне
Спраўджвае закон,

Што ўсё народжанае
Неадменна

Без вынятку
Асуджана на скон.

---

[3] Самастрат (дыял.) - самагубца.



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА.pdf

"Я ВАМ НЕ ЗДРАДЗІЎ, НЕ ЗМАНІЎ…"

Да 130-годдзя нараджэння песняра рэвалюцыі Міхася Чарота

АДКАЗАЦЬ адназначна, калі я ўпершыню пачуй імя і радкі Міхася Чарота - не бяруся. А вось калі пазнаёміўся з ягонай творчасцю па-сапраўднаму - скажу дакладна: на другім курсе любімага журфака. Беларускую літаратуру ў нас выкладаў малады дацэнт Рыгор Семашкевіч. Звычайна без асаблівага ўздыму і захаплення, спакойна і сцішана ён распавядаў пра чарговага літаратара ці ягоны твор. Калі ж чарга дайшла да Чарота - імгненна ператварыўся. Узнёсла гаварыў і пра " шчырасць пачуццяў", і "высокі грамадзянскі дух", і "ўсёпераможны аптымізм", і "ўсход надзеі", і "зорны небасхіл"… Карацей, пра словы і сімвалы, якія *"ўвасаблялі запаведную мару рэвалюцыйнага народа"*. Гаворка, калі хто здагадаўся, ішла пра адну з самых вядомых паэм паэта "Босыя на вогнішчы".

САПРАЎДНАЕ прозвішча аўтара - Міхаіл Сымонавіч Кудзелька. Ён нарадзіўся 7 лістапада 1896 года ў гарпасёлку Рудзенск Ігуменскага павета (цяпер Пухавіцкі раён). Пачаў сачыняць у 13 гадоў і стаў адным з лідараў тагачаснай беларускай савецкай літаратуры. У яго вучыліся нашыя вядомыя, пачынаючы з Кандрата Крапівы і Петруся Броўкі, літаратары. Сам жа ён вучыўся вельмі шмат: у наёмнага настаўніка, самастойна, у Цітвянскай двухгадовай вучэльні, Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, Менскім вышэйшым педагагічным інстытуце, у Маскве ў Дзяржаўным інстытуце журналістыкі.

У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937-га ў ліку 22 беларускіх пісьменнікаў быў расстраляны. Восьмага снежня 1956-га рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабістая справа нумар 8153 з фатаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Паверыць на слова - і то цяжка. А як паверыць у свой лёс, лёс тых, хто разам з табой, здаецца, здольны здзейсніць агульныя спадзяванні і намаганні, стварыць на разбурэнні і крыві новую, светлую будучыню? Тым больш, калі жывеш і творыш на вастрыні сацыяльных канфліктаў, у небывалых дасюль супярэчлівых сітуацыях, калі цяжка вызначыцца, хто чужы, а хто свой, як увогуле да незвычайных сітуацый адносіцца… Чарот вызначыўся. У яго хапіла і жадання, і рашучасці, і смеласці, каб цвёрда пераканацца ў шчаслівасці і літасці і свайго, і чужога лёсу, паверыць "у заўтра" гэтак, як мая родная рэчка Лешча верыць у надыход вясны. *"Я іду ў заўтра, а заўтра - гэта Вялікая Будучыня"*, - заявіў і сцвердзіў паэт у вершы "Песня беларуса", надрукаваным у першым жа сваім зборніку "Завіруха", што пабачыў свет у 1922 годзе. Толькі вось сцэнарый казкі пра будучы рай быў напісаны зусім іншы…

Ніколі не думаў, што менавіта "Босыя на вогнішчы" трапяцца мне на будучым экзамене. Увогуле



падрыхтаваўся нядрэнна. Уважліва прачытаў і паэму - пра пажар на Усходзе, пра агонь, у якім марнее ўсё, што збіралі вякамі. Асабліва ўрэзалася пра знішчэнне таварышамі з дымам памяці мінулага - цэркваў, палацаў і харомаў, пра што некаторыя мараць і сёння. Дарэчы, прыхапіў з сабой сшытак з лекцыямі, сярод якіх была і Семашкевічава. Ведаў, што яму падабаецца, калі за ім запісваюць і на яго спасылаюцца. І вось, адказваючы на білет, пасля таго, як дайшоў да тых пабудоў, што разбураюцца і гараць у агні, - не змог далей гаварыць. Мне стала натуральна дрэнна (і сёння дрыжыкі па целе) не толькі маральна, але і фізічна. Валодзя Саламаха, вядомы сёння пісьменнік і крытык, з якім мы падчас вучобы моцна сябравалі (павінен быў адказваць за мной) так перапужаўся, што кінуў рыхтавацца, падбег да графіна і наліў мне вады. Разгубіўся і выкладчык… Я, усё ж, узяў сябе ў рукі і працягнуў адказваць. Мае дзяды і бабулі былі веруючымі. У якаўлевіцкай і анікавіцкай хатах на мяне глядзелі з дзяцінства божыя абразы, прад якімі, асабліва, бабулі Акуліна і Марыя, заўсёды ўтрапёна маліліся. Ды і расказы дзядоў Ільі і Лукі добра памятаў. Да таго ж, для добрай адзнакі вырашыў "здзівіць" Семашкевіча тым, што сам пішу вершы, што яны друкаваліся ў вайсковай і раённай газетах. Але падобнае на тое, што напісаў Чарот, не напісаў бы ні тады, ні сёння…

- У якім сэнсе? - інтэлегентна-рашуча ўскінуў вочы пад дах аўдыторыі Рыгор Міхайлавіч.

- Шкада ж усяго, што гіне, людзі ж будавалі, верылі, спрачаліся, спадзяваліся… Вы ж самі казалі, вось я занатаваў у сшытку (паказаў, дазвалялася прыносіць, але



не карыстацца падчас адказу), што ў творчасці павінны быць стваральныя матывы. Цяпер ужо ваду піў выкладчык. Хлапец, не буду называць яго прозвішча, які сядзеў за Саламахам, схапіўся за галаву, ён пазней працаваў зусім не ў журналістыцы, тым больш, не ў літаратуры. Семашкевіч задаў дадатковае пытанне, на якое я не адказаў і ўбачый у залікоўцы тлустую, першую і апошнюю за ўсю вучобу, "тройку"…

ЧАСТА ўзгадваю я тую адзнаку. Перадусім яна нагадвае мне сустрэчу з творчасцю разумнага гарэзы і фантазёра Міхася Чарота. Пазней даведаўся: у сваёй лекцыі ўдумлівы і дасціпны Семашкевіч (ён трагічна пайшоў з жыцця ў свае 37(!) выкарыстоўваў матэрыялы даследчыкаў Міхася Яроша і Навума Перкіна. Апошні - адзін з аўтараў "Гісторыі беларускай савецкаў літаратуры". Пра абодвух распавядаў у сваёй кнізе "Айчыны верныя сыны" мой талачынскі зямляк і сябар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і рэспубліканскай прэміі "Залаты Купідон" Анатоль Мяснікоў.

Пра згаданую кніжку, якая павінна была хутка выйсці, Анатоль паведаміў мне па-сяброўску, здаецца, у лістападзе 1996-га. Не паспеў я ў чарговы раз зайсці да яго ў "Звязду" (у той дзень ён дзяжурыў па нумары) як пачуй звычайнае ў падобных выпадках ягонае: "Чытай заўтра нашу газету, там - "бомба!", падрабязнасці будуць у кнізе, пра якую я табе гаварыў, гранкі ўжо вычытаў!". Аказваецца, у нумар ішоў верш Чарота "Суровы прыгавор падпісваю першым". Твор, які не друкаваўся нідзе з 1930 года, калі ад яго трапяталі старонкі "Полымя" і "Маладосці":

Чаго хацелі вы? Якое мелі права
Крывёю гандляваць працоўных Беларусі?
Прыйшла на вас суровая расправа,
Перад судом віну прызнаць прымусім.
Вы прытаіліся пад венікам, як мышы,
Каб зноў паўзці на вольныя загоны,
Вы марылі ўзабрацца на ўзвышшы
І дыктаваць драпежныя законы.
Наш смелы крок - узвышша зараслося,
Законы піша дыктатура працы.

Выкрывальны верш прысвячаўся выдатнаму пісьменніку, крытыку, публіцысту і вучонаму Вацлаву Ластоўскаму, аднаму з выдатнейшых дзеячаў у гісторыі нашай культуры Максіму Гарэцкаму, а гэтаксама адным з заснавальнікаў літаб'яднанняў "Маладняк" і "Узвышша" Язэпу Пушчу і Алесю Дудару. Іх ды іншых Чарот асуджаў за нацдэмаўшчыну. Улетку 1930-га ў ліку 108 дзеячаў беларускай навукі і культуры іх арыштавалі па справе "Саюзу вызвалення Беларусі". З іх 86 асудзілі. Многіх рсстралялі, іншыя згінулі ў розных лагерах. Версій сапраўднага існавання СВБ жыло нямала, пакуль Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ не накіраваў у 1988-м зварот у КДБ СССР. Адтуль адказалі: *"… пасля руплівага вывучэння архіўных матэрыялаў, якія б пацвярджалі існаванне "Саюза вызвалення Беларусі", не знойдзена".*

Атрымліваецца, жорсткая справа - гэта палітычна-крымінальны дакумент, па якому без суда і следства былі знішчаны ці пацярпелі вядомыя людзі краіны. Атрымліваецца і тое, што, хай сабе і ўскосна, дапамог гэтаму ліхадзейству Міхась Чарот. "Бомба", пра якую казаў Анатоль, стала, "вяршыняй імкнення Чарота да гімназацыі крывавых падзей дваццатых-трыццатых гадоў". Гэтае сцвярджэнне і абяцаныя мне падрабязнасці вакол верша ў "Звяздзе" знайшлі сваё месца ў артыкуле Мяснікова "Паэт-трыбун. Чалавек часу. Ахвяра рэжыму". Разам з іншымі ён склаў зборнік гістарычных нарысаў "Айчыны верныя сыны", што пабачыў свет у 1977-м. Менавіта гэтую кніжку меў Анатоль на ўвазе, і праз нейкі час мне яе падпісаў. З нарыса я зразумеў: друкуючы верш, газета разлічвала атрымаць і на яго, і на сам факт яго з'яўлення на старонцы хоць колькі водгукаў. Даляцеў жа - адзін… Даволі аялікі, ён быў ад прафесара з Брэста. *"Такі ўрок,* - адгукаўся ў прыватнасці прафесар, - *трэба выкарыстоўваць дзеля таго, каб не паўтарыліся абставіны, якія прымушаюць чалавека забывацца аб сваім прызначэнні, аб тым лепшым, чым адаравала яго прырода. Кожнаму чалавеку ў любы момант наканавана праходзіць выпрабаванне на чэснасць і подласць. Вера ў перамогу гістарычнай праўды дапамагае зрабіць маральны выбар на карысць дабра. Толькі трэба глыбока ўнікаць у трагедыю эпохі, у трагедыі асабістых лёсаў".*

ЗДАРАЮЦЦА моманты, калі, сапраўды, даводзіцца рабіць той ці іншы выбар. Які правільны, за які потым не будзе сорамна, і за які не трэба будзе ў будучым выбачацца - вырашаць, канечне ж, самому. Чарота ніхто ні за вошта не агітаваў. Ён адназначна выбраў рэвалюцыю і нарадзіў той высокі пафас яе апявання, да якога ні да яго, ні пасля яго ніхто так і не ўзняўся. Калі чытаеш, здаецца, нехта планаваў нарадзіць яго менавіта ў дзень будучай рэвалюцыі, і чырвоным па ўспрыманні падзей. А падзеі, у адказ, выказваюць вялікую за гэта падзяку, і шчэ з большым жаданнем, натхненнем і напорам робяць сваю справу.

Паэт ганарыўся тым, што нарадзіўся менавіта 7 лістапада і атрымліваў штогод новыя падарункі ў выглядзе " новых здзяйсненняў". *"Рэвалюцыя сваім агнём,* - казаў у той час Цішка Гартны, - *апякла пачуцці М. Чарота і ўклала ў яго песні напал і бадзёрую надзею, парыў паўстання".*

Дадам да гэтага, што Чарот марыў і ўжо ўяўляў час, калі па ўсім свеце "пранясецца рэвалюцыйная бура". У зборніках "Завіруха" і "Веснаход" - браты і сёстры гэтай буры: вецер, навальніца, завіруха, чырвонае вогнішча, буралом, агонь, пажар… Толькі вось жыве ў вершах "распранутая рыторыка, ура-патрыятызм, погляд на рэчаіснсць праз ружовыя акуляры".

Дарэчы, пры жыцці песняра рэвалюцыі ягоная творчасць ніколі не ацэньвалася адназначна. Язэп Пушча, напрыклад, крытыкаваў паэму "Ленін". І, ведаеце, за што - за "валявыналёгкія і гранітна-васковыя" прыёмы. А яшчэ… "за адсутнасць зместу". А Максім Гарэцкі, у той жа час, згадваючы ўсе шэсць паэм ("Босыя на вогнішчы"" "Ленін", "Карчма", "Марына", "Беларусь лапцюжная" і

"Чырвонакрылы вяшчун") канстатаваў, што ўсе яны - "найлепшае ў беларускай пралетарскай паэзіі". Сам жа Чарот быў для Гарэцкага таленавітым, але (і гэта пацвярджае мной ужо сказанае) супярэчлівым паэтам. Іншыя адначасова адзначаюць і гіпербалічнасць прыёмаў, і што ён *"першы на беларускіх загонах ажыццявіў на практыцы погляд на літаратуру, як на зброю класавага змагання"*. Тым самым удакладніў, развіў і ўзмацніў свой выбар. Што тычыцца таленту, то ён праявіўся не толькі ў паэзіі (паэтам ён быў, як кажуць, з Божае ласкі), але і ў прозе, і ў драматургіі. Звяртае на сябе ўвагу зборнік апавяданняў "Веснаход". Сярод лепшых п'ес -"Мікітаў лапаць" і муздрама "На Купалле".

Але ні талент, ні патрыятызм, ні адданасць справе рэвалюцыі, ні звышчалавечая вера ў светлую будучыню, ні, урэшце, ТОЙ верш бацьку чацвярых дзяцей не ўратавалі.

Як не ўратавалаі і членства ў партыі, і пасада рэдактара "Савецкай Беларусі", і стварэнне "Маладняка", і членства ў ЦВК БССР, і многае іншае… 24 студзеня 1937-га кансультанта маладых аўтараў Саюза пісьменнікаў БССР, як удзельніка "нацдэмаўскай, контррэвалюцыйнай і антысавецкай ("чаму гэта ён там моладзь вучыць?!") арганізацыі" арыштавалі. Ён сядзеў спачатку ў адной камеры з паэтам Юркам Лявонным. У засценку турмы Чарот быў маральна і псіхілагічна зламаны. Ён напісаў свой апошні верш, які стаў споведдзю не толькі перад сабой, але і перад усім сваім народам, якому зычыў працвітання і шчасця:

Я вам не здрадзіў,
Не зманіў,
Бо славіў наш савецкі будзень,
Свой верш сардэчнай чысціні
Ахвяраваў я родным людзям.
Я не чакаў
І не гадаў.
Бо жыў з адкрытаю душою,
Што стрэне лютая бяда
Падружыць з допытам,
З турмою.
Прадажных здрайцаў ліхвяры
Мяне зацiснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары, -
Кажу вам: я не вінаваты!
Паверце - я не вінаваты!

ТАКІ вось зварот, такі крык душы і сэрца. Па ўспамінах паэта, пісьменніка і перакладчыка Міколы Хведаровіча, якога арыштавалі 3 жніўня 1938-га, а ў 1940-м асудзілі на 8 гадоў пазбаўлення волі, у 1939-м яго перавялі ў камеру-адзіночку. Адразу ж пачаў уважліва аглядаць сцены. І ў адным з куткоў прачытаў і запомніў выкалупаны нечым вострым тэкст споведзі Чарота, якую апублікаваў у паэтычным зборніку толькі ў1965 годзе…

Уладзімір Барысенка.

ПАМЯЦІ АНАТОЛЯ КАЛЕДЗІЧА РАЗВІТАЛЬНЫ МАНАЛОГ

Памяці сябра-афіцэра міліцыі
Анатоля Каледзіча

І вось, Гасподзь, маё галоўнае пытанне:
ці выканаў сваё я абяцанне -
спагадлівым на белым свеце стаць,
хоць перад тым, як будуць адпяваць?..
Якую вестку землякам можаш давесці?
Цябе не буду я за грудзі твае трэсці,
каб вытрасці станоўчы твой адказ,
ціха звяртаюся… прабач… ў апошні раз.
Прыму любое я рашэнне тваё, Божа,
мо дараваць усё усім мне дапаможаш,
з бяздушнасцю і злосцю я змагаўся
і стаць спагадлівым, павер, усё ж стараўся…

Уладзімір Барысенка.
13. 11. 2026 г.



54-гадовы старшыня савета ветэранаў Дэпартамента аховы МУС РБ Анатоль Каледзіч і сябра савета Уладзімір Барысенка ў гасцях у ганаровага ветэрана Генадзя Чачанца, 16. 10. 2026 г.

Даследчык беларускай, балгарскай і македонскай моваў

30 кастрычніка спаўнілася 90 гадоў з дня нараджэння буйнога навукоўцы-лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара Генадзя Цыхуна (1936-2024), імя якога шырока вядома ў беларускім і замежным навуковым свеце.



Генадзь Цыхун нарадзіўся ў вёсцы Кунцаўшчына Гарадзенскага раёна ў сям'і настаўніка і краязнаўца Апанаса Цыхуна. Пасля паспяховага заканчэння сярэдняй школы (1953) Генадзь Цыхун вучыўся ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці "славянскія мовы (балгарская і руская мовы і літаратуры)".

У 1966 годзе Генадзь Цыхун абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Сінтаксіс займеннікавых клітык у балгарскай і македонскай літаратурных мовах", а ў 1982 годзе - доктарскую на тэму "Тыпалагічная праблема балкана-славянскага моўнага арэала".

Генадзь Цыхун з'яўляецца аўтарам больш за 300 фундаментальных навуковых прац па тэорыі моўных саюзаў, па арэальнай лінгвістыцы, балканістыцы, сацыялінгвістыцы, беларускай этымалогіі, гісторыі і бібліяграфіі беларускай мовазнаўчай славістыкі. Ён суаўтар "Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы".

Навуковае жыццё Генадзя Цыхуна было звязана ў першую чаргу з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. З 1958 годзе ён працаваў у акадэмічным Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа, а з 1990 года быў загадчыкам аддзела славянскага і тэарэтычнага мовазнаўства. З 2005 года вучоны з'яўляўся галоўным навуковым супрацоўнікам аддзела славістыкі і тэорыі мовы Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. Беларускі лінгвіст быў прызнаны ў замежных навуковых колах на самым высокім узроўні. Генадзь Цыхун - акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, акадэмік Македонскай акадэміі навук (з 2004 г.), доктар honoris causa Сафійскага ўніверсітэта (з 2005 г.).

Генадзь Цыхун быў незаменным удзельнікам разнастайных высокааўтарытэтных камітэтаў і навуковых саветаў: членам Прэзідыума Міжнароднага камітэта славістаў (з 2004 г.), намеснікам старшыні Беларускага камітэта славістаў (з 1992 г.), членам камітэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сустаршыня Таварыства дружбы Беларусь - Балгарыя (з 1992 г.).







Генадзь Цыхун заўсёды з задавальненнем запрашалі на высокія навуковыя форумы і заўсёды чакалі яго выступленняў, якія ўражвалі шырокай эрудыцыяй, аргументаванасцю і мелі вялікую ступень уздзеяння на аўдыторыю. Беларус актыўна спалучаў навуковую працу з выкладчыцкай дзейнасцю. Ён з'яўляўся прафесарам кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства БДУ і шмат гадоў выкладаў на філалагічным факультэце сучасныя балгарскую і македонскую мовы, чытаў спецкурсы па тыпалогіі славянскіх моў, арэальнай лінгвістыцы, беларуска-іншамоўнай лексікалогіі і іншыя. Генадзь Апанасавіч лёгка ўстанаўліваў кантакт са студэнцкай аўдыторыяй. Студэнты-філолагі з энтузіязмам вучыліся ў яго генерыраваць новыя навуковыя ідэі, творча пераасэнсоўваць назапашаны ў лінгвістычных даследаваннях тэарэтычны і эмпірычны матэрыял, працуючы пры гэтым згодна з прынцыпамі той навуковай славістычнай школы, традыцыі якой так старанна захоўваў і перадаў моладзі Генадзь Цыхун.

Паводле СМІ.

Новае выданне

Кніга пра Сынковіцкую царкву

Упершыню ў Беларусі выйшаў з друку зборнік гісторыка-краязнаўчых і архітэктурных даследаванняў, прысвечаных гісторыі Сынковіцкай царквы Святога Архангела Міхаіла Зэльвенскага раёна. Ён называецца "Сынковіцкая царква - таямніца вечнасці". Зборнік склалі артыкулы, напісаныя даследчыкамі ў XIX- пачатку XXI стагоддзяў. Кнігу сабраў, напісаў прадмову і каментар даследчык нашай літаратуры і культуры Сяргей Чыгрын.



Пра Сынковіцкую царкву даследаванняў было напісана і апублікавана не так і шмат. Хаця сам храм з'яўляецца адным з найцікавейшых узораў храма абарончага тыпу ў беларускім дойлідстве XIV-XVI стагоддзяў. У аснову архітэктурнага вобразу царквы пакладзены прынцып спалучэння богаслужбовых і абарончых функцый.

У кнігу "Сынковіцкі храм - вечная таямніца" увайшлі артыкулы адных з першых даследчыкаў Сынковіцкай царквы Юзафа Ядкоўскага, Плакіда Янкоўскага, Пампея Бацюшкава, Міколы Шчакаціхіна, Васіля Супруна, Міхася Ткачова, Уладзіміра Чантурыя і іншых. Пазнейшыя даследчыкі ў асноўным спасылаліся на іх даследаванні, дапаўняючы свае матэрыялы невялікімі археўна-навуковымі знаходкамі. Але кожны артыкул аўтараў, якія надрукаваны ў гэтым зборніку, даволі цікавы і разнастайны.

Унікальнасць кнігі яшчэ і ў тым, што матэрыялы ў ёй аздоблены рэпрадукцыямі некаторых сучасных паштовак, канвертаў, паштовых марак, малюнкаў мастакоў, а таксама здымкамі сувенірнай прадукцыі, якая выдавалася і прысвячалася Сынковіцкаму храму.

Ганна Жук.

Яшчэ адна кніга ад Леаніда Лаўрэша



Лаўрэш Леанід. Знаходкі пахаванняў вялікіх князёў і каралёў. 2026. - 60 с. ISBN 978-5-0071-4135-2

У кнізе расказваецца пра знаходку ў першай палове XX ст. пахаванняў вялікага князя і караля Аляксандра, вялікіх княгінь і каралеў Барбары і Лізаветы, перазахаванне парэшткаў вялікіх князёў і каралёў Станіслава Ляшчынскага і Станіслава Аўгуста Панятоўскага і пра пошукі магілы вялікага князя Вітаўта.

У якасці дадаткаў у кнігу ўвайшлі артыкулы:

Пасмяротная перагрынацыя парэшткаў караля Станіслава Ляшчынскага з Ленінграда ў Вавель. Акт.

Вяртанне ў 1938 г. парэшткаў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага з Ленінграда

Ціхае вяртанне парэшткаў караля Станіслава Аўгуста ў родны край

Чыноўнік забараняе маліцца за караля, ці Таямніца 14-й ліпеньскай ночы ў Воўчыне

Столь можа абрынуцца на саркафаг! Воўчын.

Пошукі магілы Вітаўта

Магіла вялікага Вітаўта

Лёсы парэшткаў Вітаўта

Абуджаная надзея. У пошуках парэшткаў Вітаўта.

На першай вокладцы - касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Воўчыне ў 1930-х гг.

Сусвет літаратурнай Ліды Наталлі Анашкевіч

У Доме Валянціна Таўлая Лідскага гісторыка-мастацкага музея адбылася прэзентацыя дзвюх выдадзеных у 2026 годзе кніг - "У сузор'і Жанчыны" і "Лида. Литературный код". Складальнікам і аўтарам гэтых выданняў з'яўляецца настаўніца рускай мовы і літаратуры Сярэдняй школы № 11 г. Ліды імя Н.І. Паповай, пісьменніца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Анашкевіч.

Творчы набытак Наталлі Мікалаеўны ўжо дасягнуў значных маштабаў. З-пад яе пяра выйшлі кнігі: "Православные храмы Лидчины: история и современность" (2021 г.), "В калейдоскопе школьных дней" (2022 г.), "Герб города Лиды - историко-геральдический памятник Беларуси" (2023 г.), "Мои КЛАССные попутчики" (2024 г.), "Паэтычнае суквецце Лідчыны: майстры





слова пра сябе і сваю паэзію" (2025 г.) і іншыя. А колькі ў яе багажы глыбокіх даследчых прац, у якіх толькі навукова-практычных канферэнцыях яна не брала ўдзел! І для кожнай справы яна знаходзіць час, хоць яе асноўная праца - выкладанне ў школе, дзе таксама неабходна пастарацца, каб навучальны матэрыял быў цікавым і запамінальным. Да кожнага вучня Наталля Мікалаеўна знаходзіць свой ключ і падыход, рыхтуе інтэрактыўныя заняткі. Дзякуючы класнаму кіраўніку вучні ўжо не першага выпуску блізка знаёмяцца са спадчынай свайго краю. Менавіта ў гэтым і заключаецца выхаванне маладога пакалення, стымул любіць малую і вялікую Радзіму. У школу Наталля Анашкевіч заўсёды ахвотна запрашае майстроў прыгожага пісьменства, таму вакол яе заўжды віруе жывы рух і творчая актыўнасць.

Па назвах кніг лёгка заўважыць, куды скіравана ўвага лідзянкі. Яна нястомна даследуе родны край, вывучае гісторыю праваслаўных святынь прынёманскага рэгіёна, знаходзіцца ў самым эпіцэнтры культурнага і літаратурнага жыцця. Сваімі адкрыццямі і ўражаннямі ад падарожжаў па славутых мясцінах Наталля Мікалаеўна шчодра дзеліцца на старонках выданняў "Лідская газета", "Зорька", "Літаратура і мастацтва", а таксама часопіса "Лідскі летапісец". Гэты сабраны матэрыял кладзецца ў аснову кніг, якія становяцца каштоўнай крыніцай для далейшых краязнаўчых і навуковых даследаванняў.

У доме паэта сабраліся сябры-аднадумцы, настаўнікі і літаратары Лідчыны. Прысутныя яшчэ раз шчыра павіншавалі Наталлю Мікалаеўну з заслужаным уступленнем у Саюз пісьменнікаў Беларусі і пажадалі ёй плёну і новых творчых здзяйсненняў на карысць краіны.

Каб імпрэза атрымалася больш яскравай і душэўнай, Наталля Мікалаеўна прыйшла з чароўным чамаданам, у якім кожны раз прыносіць унікальныя экспанаты са свайго хатняга архіва. На гэты раз там знайшлося месца рукапісам даследчых прац і паэтычным зборнікам з аўтографамі і цёплымі пажаданнямі аўтараў.

Між іншым, сустрэча мела назву "Жаночы код у літаратуры", прымеркавана да Года беларускай жанчыны і была арганізавана на часовай экспазіцыі "Таям-





№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА.pdf

нічыя жанчыны замкаў Гродзеншчыны". Шматлікія прыхільнікі ведаюць, што для Наталлі Анашкевіч характэрна не толькі шчырая любоў да роднага, але і імкненне захаваць яго для нашчадкаў. Яна прачытала са зборніка "У сузор'і Жанчыны" творы лідскіх паэтаў, якія тонка і па-майстэрску адлюстроўваюць жаночы вобраз, і падзялілася гісторыяй нараджэння задумы гэтай кнігі.

Унікальным выданнем для літаратурнага краязнаўства з'яўляецца і другая кніга - "Лида. Литературный код". Пад яе вокладкай змешчаны не толькі рэдкія фотаздымкі са шматлікіх літаратурных сустрэч, зробленыя ўласна пісьменніцай, але і прыведзены факты, якія дэталёва фіксуюць летапіс мясцовага літаратурнага руху, які яна вывучае амаль дваццаць гадоў. Фінальным акордам гэтага раздзела сталі мерапрыемствы, якія прайшлі ў Лідзе 6 і 7 верасня 2025 года ў рамках Дня беларускага пісьменства. Пра грунтоўнасць падыходу сведчыць і спіс выкарыстаных крыніц, які налічвае больш за дзвесце пазіцый.

Наталля Мікалаеўна беражліва захоўвае кнігі з дарчымі надпісамі аўтараў, газетныя артыкулы і рэдкія публікацыі, што ўжо сталі гісторыяй. На сустрэчы пісьменніца пазнаёміла прысутных з кнігамі лідскіх паэтэс Алесі Бурак, Ірыны Бараздзіной, Таццяны Сямёнавай. Пра кожную з іх у яе свой адметны і глыбокі расповед. У гэтым можна пераканацца, пазнаёміўшыся з яе даследаваннямі, якія знайшлі сваё месца ў раздзелах кнігі: "Образ родного города в поэтических сборниках "Мой любы горад Лида" і "Мой горад - гонар мой", "Образ лирической героини в поэзии Алеси Бурак" (на примере русскоязычного цикла стихотворений "Стихи - страницы жизни" из сборника "Прастора дабрыні"), "Духовные искания лирической героини в поэтическом сборнике "Из соли, сахара и перца" русскоязычной поэтессы Ирины Семёновны Бороздиной", "Тема природы в творчестве Татьяны Ивановны Семёновой".

На прыкладзе творчай і грамадскай дзейнасці Наталлі Мікалаеўны можна адзначыць, што Лідскі край - гэта месца, якое няспынна натхняе і зараджае кожнае пакаленне на любоў да Радзімы, да захавання мінулага, да той глыбіні, якая перадаецца нам ад продкаў, бо ў пачатку было Слова…

Алесь Хітрун,
навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея.

Крок да веры

10 лістапада ў сценах ДУК "Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы" адбылася значная падзея - Калядныя епархіяльныя чытанні, бібліятэчная секцыя. У гэты дзень супрацоўнікі бібліятэк, прыхаджане і ўсе жадаючыя сабраліся, каб разам са святарамі пагрузіцца ў глыбіні Святога Пісання.







Цэнтральнай тэмай мерапрыемства стала асэнсаванне першай часткі Бібліі, прысвечанай стварэнню свету і чалавека. У сваім глыбокім і пранікнёным выступе настаяцель прыхода храма Хрыста Збавўцы г. Ліды протаіерэй Максім Цыгель даступна і займальна раскрыў біблейскае апавяданне пра пачатак усяго існага. Слухачы з непадробнай цікавасцю слухалі расказы пра шэсць дзён тварэння, пра веліч Божай задумы, закладзенай у аснову светабудовы.

Асаблівая ўвага была ўдзелена гісторыі стварэння чалавека - як вянца тварэння, вобразу і падабенства Божага. Было падкрэслена духоўнае значэнне гэтай падзеі, паказана, як біблейскія ісціны аб паходжанні чалавека працягваюць заставацца актуальнымі і значнымі для разумення нашай сутнасці і месца ў гэтым свеце.

Удзельнікі мерапрыемства мелі магчымасць задаць пытанні, абмяняцца думкамі і атрымаць вычарпальныя адказы. Такія сустрэчы, як епархіяльныя чытанні, адыгрываюць важную ролю ў духоўнай асвеце грамадства, умацаванні веры і фарміраванні маральных каштоўнасцей.

ДУК "Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы" зноў пацвердзіла свой статус не толькі захавальніка ведаў, але і важнага культурнага і духоўнага цэнтра, адкрытага для правядзення значных мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць духоўнаму росту і асвеце жыхароў горада.

Бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы
Кацярына Сандакова.

Пяць танцаў для рыцара

Ажыўшая казка ў старадаўнім куфэрку: лідскі тэатр "Батлейка" зачараваў гледачоў спектаклем "Пяць танцаў для рыцара".

Конкурсны марафон у малой зале Палаца культуры горада Ліды прыцягнуў па-сучаснаму ўнікальны, самабытны калектыў - народны лялечны тэатр "Батлейка" аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці". Пад кіраўніцтвам Ірыны Іванаўны Вашкевіч, якая выступіла і аўтарам п'есы, артысты прадставілі публіцы і журы паэтычную пастаноўку "Пяць танцаў для рыцара".





Гэты калектыў, заснаваны ў 2007 годзе, даўно стаў сапраўдным культурным гонарам Лідчыны. Удзельнікі "Батлейкі" не проста беражна адраджаюць старадаўні беларускі народны тэатр лялек, даследуючы гісторыю касцюма і ствараючы дэкарацыі і герояў уласнымі рукамі, але і адважна напаўняюць традыцыйную форму сучасным, жывым гучаннем.

Гледачы літаральна стаіўшы дыханне сачылі за тым, як у руках майстроў ажываюць лялькі, а прыгожая, кранальная гісторыя пра высакароднасць, каханне, мары







і выпрабаванні раскрываецца праз музыку і пластыку танца. Лідскім артыстам удалося стварыць на сцэне адмысловую, ні з чым не параўнальную атмасферу цеплыні і чараўніцтвы - тую самую, якая аднолькава зачароўвае і дзяцей, і дарослых.

Глядзельная зала шчодра аддзячыла землякоў шчырымі ўсмешкамі і гарачымі апладысментамі, бо кожная сустрэча з мастацтвам лідскай "Батлейки" - гэта маленькая вандроўка ў свет прыгажосці і народнай мудрасці.

ТК "Культура Лідчыны".



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
НАША СЛОВА .pdf

Станіслаў Суднік

ЯЦВЯЖСКІЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Сармацкая легенда

Частка I

У № 27 у “Яцвяжскіх замалёўках” ёсць такі фрагмент: *“Кім былі яцвягі? Гэтая праблема ўжо цікавіла некаторых сярэднявечных і рэнесансных аўтараў. У 16-17 стагоддзях была высунута, напрыклад, ідэя аб тоеснасці з вядомымі са старажытных часоў язычамі – адгалінаваннем іранамоўных аланаў (сарматаў), якія, верагодна, у 1-м стагоддзі нашай эры пасяліліся паміж Дунаем і Цісай. Польскі гісторык Марцін Кромер, які быў першым ці адным з першых навукоўцаў, хто прыняў гэтую думку, напэўна, быў прывабленыы пэўным падабенствам племянных назваў: язычы – яцвягі і тым, што стара-жытныя язычы раптоўна і даволі таямнічым чынам знікаюць са старонак гісторыі напрыканцы антычнасці; ён выказаў здагадку, што яны эміграваліабо былі выцесненыя з Панонії (гунамі?) і пайшлі*


MATTIAS STRIICO
VIVS OSOSTEVICIVS C: S: Hiſtor: &
Poëta: ætatis ſuę anno 34. ſalutiferi partus 1581.

Matthias tibi eſt Striicovius ore videndus,
Oſtrovia domus ſpectat parentum genus.

Stemmatis egregii ſplendor, ſed maior honeſtis
Moribus, & ſacri dogmatis eſt amor.


KTÓRA PRZEDTYM NIGDY ŚWIATŁA NIE WIDZIAŁA

KRONIKA

POLSKA, LITEWSKA, ŻMÓDZKA,

I WSZYSTKIEJ RUSI

Kijowskiej, Moskiewskiej, Siewierskiej, Wołhińskiej, Podolskiej, Podgórskiej, Podlaskiej, etc. I rozmaite przypadki wojenne i domowe, Pruskich, Mazowieckich, Pomorskich i inszych kraiu Królestwu Polskiemu i Wielkiemu Xięstwu Litewskiemu przyległych, według istotnego i gruntownego zniesienia pewnych dowodów z rozmaitych historików i autorów postronnych i domowych, i Kijowskich, Moskiewskich, Sławańskich, Liflantskich, Pruskich starych, dotąd ciemnochmurną nocą zakrytych Kronik i Latopiseczów Ruskich, Litewskich, i **Długosza** Ojca dziejów Polskich z inszymi, z wielką pilnością i węzłowatą pracą (osobliwie około dziejów Litewskich i Ruskich od żadnego przedtym niekuszonych)

przez

Macieja Ososteviciusa Stryjkowskiego

dostatecznie napisana, złożona i na pirwsze światło z wybadaniem prawdziwie dowodnej starodawności własnym wynalezieniem, przezwałym dochcipem i nakładem nowo wydźwigniona, przez wszystki starożytne wieki, aż do dzisiejszego roku 1582.

A naprzód wszystkich ile ich kolwiek jest ludzkich na świecie narodów gruntowne wywody.

Z łaską i przywilejem Kro: J. M:

DRUKOWANO W KRÓLEWCU U GERZEGO OSTERBERGERA

M. D. LXXXII.

“глыбей у Сарматыю”… …Цікава, што яе прыхільнікамі былі яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя стваральнік “навуковай” польскай гістарыяграфіі – біскуп Адам Нарушэвіч, а ў XIX стагоддзі – выдатны вучоны і стваральнік навукі аб славянскіх старажытнасцях – Павел Юзаф Шафарык…”

Не абышоў бокам яцвягаў-язычаў і славуты Мацей Стрыйкоўскі. Ён нават паказвае, куды гэтыя язычы дзеліся і дзе іх шукаць. Хроніка Стрыйкоўскага апісвае татальнае знішчэнне яцвягаў палякамі ў 1264 годзе. Гэта адбылося пасля смерці караля Міндоўга і распачатай затым грамадзянскай вайны ў Літве.

“Зацятая бітва яцвягаў з палякамі.

Потым польскі манарх Баляслаў Пудыка ці Сарамлівы ў 1264 годзе сабраў вялікае войска супраць тых яцвягаў. І калі 21 чэрвеня [ён] уварваўся ў іх зямлю, яцвягі са сваім князем Комотам (Comatem) з варварскай адвагай і зацятасцю так ахвотна і з вясёлымі крыкамі

біліся з палякамі, што пры няроўным ліку некалькі разоў давалі ім адпор. І хоць забілі іх князя Комата, яны, як і перш, адважна абараняліся, пакуль палякі не перабілі іх усіх да адзінага пры сваёй крывавай перамозе на тым полі. З тых часоў [яцвягі] сапраўды згінулі, як пішуць Длугаш, Кромер (кн. 9), Мяхоўскі (кн. 3, гл. 45, стар. 145), Вапоўскі і Бельскі (стар. 252 у другім выданні), амаль вымерлі.

Ita fortiter dimicantes ad intenetionem usquae caesi sunt, adeo ut ex eo tempore nomen quoquae Jasygum pene deletum sit, quoniam illa natio pedem referre, nec unquam pugnam etiam iniquam detrectare voluit. (У гэтым жорсткім баі яны былі знішчаны так, што з таго часу імя языгі амаль сцерлася, бо для гэтага народа было немагчыма выйсці з бою і спыніць ваяваць). Мяхоўскі і Кромер.

Вось так гэты мужны народ яцвягаў, пабраціма і адзінародцаў літоўскіх, адважна ваюючы супраць палякаў, [быў] так жорстка пабіты і выцяты да [поўнага] знішчэння, што з таго часу і самае імя яцвягаў сцерлася [з памяці]. Бо яны не толькі не збіраліся ўцякаць з бою, але і з месца не ссунуліся і не спынялі біт-ву, хоць і бачылі яе прайгранай і [сваю] паразу. І слепа ішлі на варожыя мячы і на кровапраліцце, як на вяселле, што азначала, што яны не выродзіліся ў параўнанні з тымі кімврамі і готамі, якія ў Італіі ваявалі з рымлянамі і ад якіх яны пайшлі разам з літоўцамі і полаўцамі, што праўдзіва і пэўна. Цяпер яны яшчэ часткова засталіся каля Наваградка Літоўскага, таксама каля Райгорада і Інстэрбурга ў Прусіі, а таксама ў Курляндыі і Ліфляндыі, і каля Вялікага Ноўгарада Маскоўскага ёсць яшчэ іх зямелька, [там] яны завуцца Igowiany (ігавяны), чаму я і сам сведка. А як іх раней звалі ЯЦВЯГАМІ і ЯЗЫГАМІ, а цяпер Igowiany (ігавяны), тое гэта з-за змяняльнасці варварскіх слоў за даўнасцю гадоў, якія прайшлі [з часоў] языгаў".

І калі ўжо аўтарытэтныя навукоўцы на поўным сур'ёзе гавораць пра яцвягаў-языгаў, а значыць – пра яцвягаў-сарматаў, паспрабуем разабрацца, што тут да чаго. Найперш, што такое Сарматыя і хто такія сарматы?

Сарматыя (лат. *Sarmatia*) – познеантычная назва Усходняй Еўропы, асноўным насельніцтвам якой былі сарматы.

Упершыню тэрмін ***Сарматыя*** скарыстаны рымскім палкаводцам Маркам Віпсаніем Агрыпай (лат. Marcus Vipsanius Agrippa; 63 да н. э. – 12 да н. э.).

На працягу стагоддзяў, сарматы, з тых часоў, як перасяліліся ў Прыазоўе, былі слаба арганізаванай канфедэрацыяй, у якой асобныя правадыры кіравалі асобнымі плямёнамі. Паміж імі часта адбываліся лютыя міжусобіцы, з-за якіх набегі германцаў, скіфаў, пананійцаў і дакаў станавіліся ўсё больш і больш пераможнымі. Сарматы былі моцныя на полі бою, але ім бракавала адзінства, каб супрацівіцца сваім суседзям, якія паспелі сфармаваць дзяржавы.

Усё змянілася ў 90 г. да н. э., калі царом Хамаксобіі, вобласці размешчанай паўночней Азоўскага мора, стаў Косус. Ён быў ваяром і філосафам і задаўся ідэяй аб'яднаць свой народ, а дакладней заваяваць усе астатнія сармацкія плямёны.



Косус

Свой першы паход Косус пачаў у 88 г. да н. э., імкнучыся заваяваць галоўныя сармацкія плямёны і аб'яднаць іх. Першай ахвярай Косуса стала племя Карыён, якое было заваявана. Пасля гэтага ён абвясціў пра свой план аб'яднаць Сарматыю, а ўсе тыя, хто стане ў яго на шляху, будуць знішчаны без літасці.

Паміж 88 і 86 гг. да н. э. вялікая частка Сарматыі была заваявана, за выключэннем плямёнаў баруфееў на захадзе і аланаў на ўсходзе, якія адмовіліся падпарадкавацца Косусу, і былі поўныя рашучасці ваяваць.

З войскам у 17 000 пяхоты і 1000 кавалерыі ён пачаў паход на захад. Па дарозе да яго войска далучаліся атрады іншых сармацкіх плямёнаў, якія прызнавалі яго ўладу. Гэта павялічыла колькасць яго войска да 20 000 пяхоты і 2500 вершнікаў. Што да баруфееў, то яны аб'ядналіся з суседнімі плямёнамі галаў і сабралі войска ў 27 000 чалавек, з якіх 4000 былі кавалерыстамі.

Бітва паміж двума войскамі працягвалася два дні. У першы дзень, ніхто так і не дасягнуў перавагі, пры гэтым кожнае з войскаў паменшылася прыблізна на палову. Уначы, некаторыя правадыры падуладных Косусу плямёнаў малілі яго спыніць бойню і адступіць. Аднак, сармацкі цар пакараў іх смерцю за здраду і на наступную раніцу зноў пайшоў у наступ.

Гэтым разам ён змяніў тактыку. Спачатку лагер праціўніка падвергся абстрэлу агністымі стрэламі, якія выпусцілі конныя лучнікі. У лагеры пачаўся пажар і паніка. Пасля гэтага сам Косус павёў элітны конны аддзел сарматаў, колькасцю ў 1000 ваяроў, закутых у браню ў лоб на праціўніка. Угледзеўшы ваяроў, закутых у латы, якія нясуцца на поўным скаку, галы і баруфеі не змаглі сфармаваць шэрагі для адбіцця нападу і пусціліся наўцёкі. Падчас распачатай разні загінула практычна ўсё войска, якое супрацьстаяла цару сарматаў. У гэтай бітве сарматы палонных не бралі.



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
НАША СЛОВА .pdf



Косус вядзе сарматаў у атаку

Вярнуўшыся на радзіму са сваім войскам, Косусу трэба было замацаваць аб'яднанне і скарыць апошняе, найболей моцнае племя аланаў. Аднак з аланамі ваяваць не прыйшлося, быўшы даволі ваяўнічым племем, аланы самі марылі пра аб'яднанне ўсіх сарматаў і пра далёкія паходы, якія б прынеслі ім славу. Дазнаўшыся, што ў Косуса такія ж планы яны добраахвотна ўвайшлі ў звяз плямёнаў, створаны будучым царом усіх сарматаў.

На беразе Азоўскага мора, прыблізна ў раёне Азова, была пабудавана сталіца Косуса, горад Мірыў, дзе пад роў захопленага натоўпу ён быў каранаваны як цар усіх сарматаў.



Мірыў

Далей мудры Косус пачаў ператварэнне ў дзяржаву звязу сармацкіх плямёнаў. На землях найболей шматлюдных плямёнаў былі заснаваны гарады, якія з'яўляліся сталіцамі гэтых земляў. Кожнае племя даслала Косусу аддзел вершнікаў, якія ўвайшлі ў сфармаванае рэгулярнае войска царства. Былі прызначаны кіраўнікі абласцей і заснавана падатковая сістэма. У выніку праз невялікі час царства Косуса пачало стабільна развівацца, і большасць жыхароў больш не жадала жыць у рамках сваіх плямёнаў.

Як толькі дзяржаўная машына царства пачала больш-менш стабільна працаваць, Косус пачаў глядзець на поўдзень, у бок Баспорскіх грэкаў. Баспорскае царства было вельмі багатым па антычных мерках, і Косусу не цярпелася захапіць і царства, і яго багацці.

Першы паход на Баспор адбыўся ў 75 г. да н. э., аднак грэцкая фаланга хутка збіла пыху са стэпавых варвараў, якімі грэкі лічылі сарматаў, нанёсшы ім сакрушальную паразу.

Як звычайна перамогі ўмацоўваюць дзяржаву, а паразы ўносяць смуту. Тое ж самае адбылося з маладой дзяржавай сарматаў. У краіне пачаліся хваляванні і спробы аддзялення ад царства Косуса. У выніку сармацкаму цару прыйшоўся выдаткаваць нейкі час, каб здушыць усе агмені сепаратызму і аднавіць стабільнасць у дзяржаве.

У выніку, толькі ў 67 г. да н. э., сарматы распачалі яшчэ адну спробу ўварвання ў Баспорскае царства. Гэтым разам яны дайшлі Керкінітыды (Еўпаторыя). Сарматы разрабавалі горад і ледзь не забілі ўсіх грэкаў у горадзе, калі б Косус не спыніў бойню.

Падчас гэтага паходу адбыўся адзін эпізод, які з часам сыграе важную ролю ў гісторыі. Пасля рабавання Керкінітыды на сармацкае войска напала адзінокая грачанка. Узброеная ўсяго адной дзідай яна ў адзіночку спрабавала пазмагацца з сармацкімі вершнікамі. Калі яе ўзялі ў палон высветлілася, што ёй усяго 13 гадоў, гэта ўразіла Косуса, і ён не стаў яе забіваць, а замест гэтага забралаў яе з сабой у Мірыў.

Але вернемся да паходу. І другая спроба скарыць Баспор гэтак жа пацярпела няўдачу. Пад сценамі Херсанеса ён ізноў сустрэўся з грэцкай фалангай і зноў нічога не змог з ёю зрабіць.

Усе думалі, што Косус забраў сабе Красіду ў наложніцы. Аднак ён пачаў яе выхоўваць, як уласную дачку.

Быўшы з высакароднай грэцкай сям'і Красіда была досыць адукаванай па грэцкіх мерках. Косус жа асабіста пачаў навучаць яе вайсковаму майстэрству. Ужо праз два гады Красіда стала неперасягненай наезніцай і стралком з лука, акрамя гэтага сармацкі цар асабіста навучыў яе мастацтву фехтавання.

Што да сыноў Косуса, якіх у яго на той момант было аж восем, то яны адразу незалюбілі названую сястру. Хтосьці спрабаваў яе згвалтаваць, гэтак жа ёй рабілі розныя крыўдныя паскудствы. У выніку паміж Красідай і сынамі Косуса пачала цьмець непрымірымая варожасць, якая не абяцала нічога добрага ў будучыні.

Сам жа Косус лічыў сваіх сыноў дурнымі і нікчэмнымі, ён быў упэўнены, што яны варожасцю паміж сабой разбураць з такой цяжкасцю створаную імперыю.

Усё развязалася ў 64 г. да н. э., калі пасля чарговай сваркі паміж сынамі і Красідай ён загадаў ёй пазмагацца са сваімі сынамі на смерць. Сыны Косуса не ўбачылі ў Красідзе годнага суперніка і ў выніку жорстка паплаціліся.

Красіда бязлітасна забіла сваіх зводных братоў у баі. Пасля бою, яе сукенка была так заліта крывёй, што адзін з сармацкіх вяльможаў заўважыў, што “ёй належала б пафарбаваць яе ў чырвоны колер”. Пасля гэтага Красідзе далі новае імя па яе выбары, “Бурдухан”, і абвясцілі спадчынніцай Косуса.



Красіда пасля бою

Ішоў час, Косус старэў, і яму было ўжо каля сямідзесяці. Бурдухан заставалася побач з бацькам, пакуль ён павольна завядаў. Косус атрымліваў асалоду ад гэтых апошніх дзён з дачкой і распавядаў ёй вялікія гісторыі. Ён загадаў ёй зрабіць Сарматыю вялікай і прымусіць свет здрыгануцца перад яе моцай, што і абяцала Бурдухан. Праз некалькі дзён Косус памёр, і Бурдухан была каранавана як “Цар усіх сарматаў” у 59 г. да н. э.

Пасля смерці цара Косуса, Бурдухан не спатрэбілася шмат часу, каб замацавацца на троне. На працягу месяца яе супернікі былі пераможаны, і яна занялася некаторымі рэформамі імперыі. І галоўнымі, вядома, былі ваенныя рэформы.

Войска было канчаткова пераўтворана ў выключна кавалерыйскае, а пяхота была пераведзена на дапаможныя ролі. Пры гэтым асноўнай ударнай сілай сарматаў стала цяжкабраніраваная кавалерыя, узброеная доўгімі дзідамі, правобраз будучых катафрактаў. Аднак, улічваючы ўзровень тагачаснай вытворчасці, яна не была занадта шматлікай. Яе падтрымлівалі значна больш шматлікія конныя лучнікі, якія лічыліся аднымі з лепшых вершнікаў таго часу і наносілі сапраўднае спусташэнне ў шэрагах ворагаў. Што да пяхоты, якая дзейнічала ў падтрымку кавалерыі, яна была ўзброена доўгімі дзідамі, па ўзоры грэцкіх і македонскіх. У блізкім баі сармацкая пяхота выкарыстоўвала кароткія ятаганы. Нейкія даспехі сярод пяхоты былі рэдкасцю.



Сармацкія вершнікі

Бурдухан таксама рэфармавала падатковую сістэму дзяржавы, у якой усе мужчыны і жанчыны павінны былі плаціць вызначаны падатак, каб пазбегнуць рабства.

У 56 г. да н. э. Бурдухан вырашыла праверыць сваё новае войска. І для гэтай мэты яна вырашыла выкарыстаць суседняе Баспорское царства, якое так і не скарылася яе бацьку. Для паходу ў Крым яна сабрала войска з 50 000 чалавек, што было нечуванай колькасцю ў Антычнасці.

У адрозненне ад ваеннай кампаніі бацькі, у Бурдухан усё пайшло на шмат больш удала. Яе новае войска апраўдала ўскладзеныя на яго надзеі. Танаіс, які знаходзіўся на месцы Азова, здаўся без бою і, такім чынам, пазбег жорсткасці сармацкіх войскаў. Далей сарматы рушылі на поўдзень у бок Каўказскіх гор. Хуткасць кавалерыі аказалася занадта вялікай для грэкаў, і яна дасягнула Баты (Наварасійск) і Торыка (Геленджык) раней за асноўнае грэцкае войска, якое адплыло з Крыма. Гарады адмовіліся здавацца, аднак іх хутка ўзялі ў выніку рашучага штурму, яшчэ да падыходу Баспорскага войска, пасля чаго разрабавалі і спалілі. Калі падышоў грэцкі флот, Бурдухан выкарыстоўвала сваіх лучнікаў, каб не дапусціць іх высадкі на бераг.



Сарматыя і Баспорскае царства перад уварваннем



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА .pdf

Пасля гэтага сарматы адступілі ў свае стэпы і пачалі рыхтавацца да ўварвання ў Крым. Тым часам да Бурдухан прыбыў амбасадар ад Баспорскага цара з просьбай літасці, прапануючы багаты выкуп. Аднак, Бурдухан адправіла назад запэцканы крывёй ліст папірусу і галаву пасланца. У чэрвені 56 г. да н. э. яна загадала пачаць поўнамаштабны наступ на Крым. Адразу за Перакопам сарматаў чакала Баспорскае войска на чале са сваім царом Фарнакам II. У складзе Баспорскага войска знаходзіўся таксама вялікі Пантыйскі кантынгент, саюзны Баспору. Але гэта не дапамагло, падчас рашучай бітвы, непераможная грэцкая фаланга была расстраляна лучнікамі з бяспечнай адлегласці, пасля чаго ў напад пайшлі цяжкаўзброеныя вершнікі і сцерлі рэшткі грэцкага войска літаральна ў парашок. Цар Фарнак II падчас бітвы загінуў. Неўзабаве ўсё Баспорскае царства было захоплена сарматамі і перастала існаваць.

Пасля захопу Баспорскага царства, Бурдухан звярнула свой позірк на поўдзень, на магутнае Пантыйскае царства, якое дапамагала Фарнаку ў вайне. Яна паслала 2000 вершнікаў на поўдзень, уздоўж Чорнага мора ў Понт, каб запатрабаваць ад Мітрыдата VI падпарадкавацца царыцы сарматаў ці быць знішчанымі. Аднак сармацкія вершнікі дасягнулі Каўказскіх гор і былі змушаны павярнуць назад, бо яны не змаглі знайсці праход для сармацкага войска. Таму Бурдухан адступіла, і вырашыла адкласці Пантыйскае пытанне. Аднак яна ўжо спазнала смак перамог і не збіралася спыняць свае заваёвы, а азначыла сабе новую мэту. Ёй стала Германія і лютыя германскія плямёны, якія яе засялялі.

Справа ў тым, што германцы ўжо даўно даймалі сарматаў сваімі сталымі рабаўніцкімі набегамі, і Бурдухан вырашыла раз і назаўжды развязаць гэтую праблему.

Гэта ўварванне, па сутнасці – пачатак вялікага перасялення народаў, на шмат раней, чым яно адбылося паводле гісторыкаў. Германская кампанія доўжылася тры гады, падчас яе частка германскіх плямёнаў была знішчана, частка адступіла за Рэйн, у Галію, якая тым часам падвяргалася нашэсцю рымлян пад началам Юлія Цэзара. Апынуўшыся між малатам і кавадлам, частка германскіх і кельцкіх плямёнаў вырашыла далучыцца да Бурдухан, а частка да Цэзара. Такім чынам сустрэча двух наймацнейшых палкаводцаў 1 стагоддзя да нашай эры стала непазбежнай.

Цераз Рэйн, сармацкае войска агульнай колькасцю парадку 100 000 чалавек, пераправілася ў 51 г да н. э. Яно было падзелена на тры часткі.

Тым часам Юлій Цэзар ужо пакінуў Галію і вёў цяжкую барацьбу з Пампеем за ўладу ў Рыме. Дазнаўшыся пра таямнічае войска, якое скарыла германцаў і ўварвалася ў Галію, Цэзар сабраў свае легіёны і хуткім маршам рушыў на поўнач, каб ліквідаваць пагрозу новым валадарствам Рыма.

Майстэрска манеўруючы, праводзячы сталыя напады лёгкай кавалерыяй, Бурдухан удалося завабіць легіёны Цэзара да горада Ітыюс Портус (суч. Кале), дзе была зручная раўніна, на якой можна было выкарыстоўваць усе моцныя бакі сармацкай кавалерыі. На гэтай раўніне сармацкая царыца вырашыла даць генеральную бітву Цэзару.

Цэзар прыбыў да Ітыюс Портус, напачатку жніўня 51 г да н. э., ацаніў сітуацыю і быў шакаваны памерам сармацкага войска. Як звычайна рымляне разбілі лагер, і Цэзар пачаў абмяркоўваць планы з Цітам Лабіенам пра тое, што рабіць далей. Рымляне не ведалі, якую тактыку выкарыстоўваюць сарматы, і таму паспрабавалі спровакаваць іх на напад.

Аднак Бурдухан раскусіла гэтую хітрасць і адмовілася гуляць па рымскіх правілах. Прайшло некалькі дзён, і Цэзар адправіў вершнікаў на перамовы каб высветліць, чаго жадаюць сарматы. Аднак сарматы іх забілі, гэта яшчэ больш раззлавала Цэзара.

Нарэшце Цэзар вывеў свае войскі з лагера і пачаў рыхтавацца да бітвы. Тым часам сармацкія конныя лучнікі ўступілі ў бой, наладзіўшы карусель перад рымскімі шэрагамі. Аднак рымляне засланіліся сваімі вялікімі шчытамі і неслі мінімальныя страты. Затым Бурдухан загадала сваёй цяжкай кавалерыі атакаваць легіянераў у лоб. Рымляне адбілі і гэты напад, што зрабіла на Бурдухан вялікае ўражанне. Тады зноў за справу ўзяліся ўжо адпачыўшыя і папоўніўшыя запас стрэл конныя лучнікі сарматаў. Пасля гэтага ў справу ўступіла пяхота якая складалася галоўным чынам з новых саюзнікаў сарматаў, галаў і германцаў. Калі пяхота сашчапілася з рымскімі легіянерамі, Бурдухан накіравала сваю кавалерыю для нападу на рымскі лагер.



Сармацкія лучнікі атакуюць рымскія легіёны

Калі сарматы атакавалі рымскі лагер, сам Цэзар, які знаходзіўся там, узяў у рукі зброю і падрыхтаваўся ваяваць, з жахам назіраючы, як сарматы забіваюць усіх, не беручы палонных. Дзесьці праз гадзіну вялікая частка сіл Цэзара была знішчана, толькі адна кагорта карыстаючыся блытанінай здолела сысці з поля бою і адступіць на поўдзень.

Што да Цэзара, то ён апынуўся ў пастцы ў сваім лагеры. Неўзабаве ён здаўся ў палон і паўстаў перад тварам сармацкай царыцы. Бурдухан была ўражана вайсковым майстэрствам Цэзара і прапанавала яму

далучыцца да яе ў якасці цара-кліента, каб абараніць Рым. Але Цэзар адмовіўся быць марыянеткай, і Бурдухан загадала заключыць яго ў турму. Аднак Цэзару ўдалося ўцячы. А Бурдухан дала сваім людзям трохі часу на адпачынак і працягнула кампанію ў Галіі.

Бурдухан павяла свае войскі праз Заходнюю Галію. Гальскае дапаможнае войска супраціўлялася ў Лютэцыі, але было разгромлена. Яна рушыла да Мекладунума, які здаўся і быў пазбаўлены ад рабавання. Да канца года сарматы захапілі Агедынкум (Санс), але адступілі назад у Мекладунум, каб правесці там зіму.



Царыца Бурдухан

Выступіўшы ў сакавіку 50 г. да н.э., сармацкае войска без супраціву ўзяло Агедынкум, жыхары якога ўцяклі, пачуўшы, што да іх набліжаюцца сарматы.

Пасля гэтага Бурдухан загадаў свайму палкаводцу Карзуазосу адправіцца на захад, каб разведаць мясцовасць. Карзуазос, у чэрвені, на захадзе ўзяў і разбурыў Кенаваўм, у той час як Бурдухан асадзіла Алезію. Гэты горад быў месцам, дзе Цэзар канчаткова ўціхамірыў Галію ўсяго два гады назад.

Далей Карзуазос у ліпені ўзяў Навідун і рушыў на поўдзень на тэрыторыю бітургаў, якія без супраціву здаліся сарматам, паколькі Рым не мог прыйсці на дапамогу. У жніўні Алезія пала. У гэты час Бурдухан атрымала вестку пра крызіс у Сарматыі, які патрабаваў яе прысутнасці.

Пакінуўшы Карзуазоса камандаваць войскам, яна адправілася дахаты.

Што да Карзуазоса, то ён, накіраваўся на захад, да Аварыкума (Бурж), дзе, па чутках, Цэзар засяроджваў сваё войска. Да горада ён прыбыў у канцы кастрычніка, і там сапраўды знаходзіўся Цэзар. Карзуазос атачыў і асадзіў Аварыкум.

У Аварыкуме ў Цэзара было 8 легіёнаў, агульнай колькасцю каля 40 000 чалавек. У Марка Антонія было яшчэ 3 легіёны (15 000 чалавек) у Бурдыгале, якія былі перакінуты на поўнач з рэкорднай хуткасцю. Карзуазос пачаў душыць Цэзара, адразаючы яму шляхі паставак харчоў і перакрыўшы доступ да вады. Харчы ў Цэзара заканчваліся, аднак, неўзабаве, у лістападзе, Марк Антоній прыбыў са сваімі легіёнамі і ў выніку начнога нападу здолеў прарваць сармацкую блакаду.

Гэта дазволіла войску Цэзара вырвацца з пасткі, і яго велізарнае войска адступіла да Аварыкума. Калі Карзуазос дазнаўся пра гэта, ён загадаў пачаць поўнамаштабны напад. Сарматы ўзялі горад, спалілі яго дашчэнту, але было занадта позна.

Далей Карзуазос загадаў 2000 вершнікаў адправіцца на пошукі Цэзара і Антонія, і да поўдня яны іх знайшлі. Карзуазос загадаў ім пераследваць іх, пакуль асноўнае войска рушыла наўздагон.

Калі сармацкая цяжкая кавалерыя ўступіла ў бой з рымлянамі, без падтрымкі конных лучнікаў яны панеслі цяжкія страты і змушаны былі адыходзіць. Гэта падняло маральны дух рымлян.

Карзуазос пераследаваў Цэзара і Антонія на паўднёвы ўсход. Нарэшце, Карзуазос дагнаў сваіх праціўнікаў на раўніне Кубі, дзе адбылася бітва двух войскаў.

Рымляне засвоілі ўрок бітвы пры Ітыюс Портусе і гэтым разам бітва пайшла не так, як чакаў Карзуазос. Рымскія легіёны вельмі ўстойліва ваявалі супраць сармацкай кавалерыі, і тая несла вялікія страты. У выніку бітва адбывалася на працягу трох дзён і стала адной з самых крывавых бітваў Антычнасці. Пры гэтым ніводзін з бакоў так і не дамогся вырашальнай перавагі. Сарматы страцілі 36 000 забітымі і 20 000 параненымі, а рымляне – 30 000 забітымі і 18 000 параненымі.

Пасля гэтага Карзуазос вырашыў уступіць у перамовы з Цэзарам і прапанаваў яму ўмовы міру. Пасля тых страт, што панеслі рымляне Цэзар іх прыняў. Мірная дамова была падпісана ў Аварыкуме і ўсталявала мяжу паміж дзвюмя імперыямі па рэках Рэйн і Дунай.



Гэтая карта не пускае сарматаў на поўнач ад Прыпяці і як бы выкрэслівае Беларусь і цікавую нам частку Прыбалтыкі з “Сармацкай легенды”, але тут мы падалі толькі яе пачатак.

Матэрыялы ўзяты з вольнага доступу, але хочацца сказаць вялікі дзякуй іхнім аўтарам. Мы ж працягнем “Сармацкую легенду” ў наступным нумары.

№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА.pdf

Станіслаў Суднік

БЕЛАРУСКАЯ МЕТАЛІНГВІСТЫКА

Колеры, афарбоўкі і масці ў Лідзе і ў астатняй Беларусі

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

Афарбоўкі і масці жывёлаў

Трусы

Трусы - траваедныя сысуны атрада зайцападобных (сямейства зайцавых), якія шырока распаўсюджаны ў прыродзе, разводзяцца ў сельскай гаспадарцы і ўтрымоўваюцца як хатнія гадаванцы.

Асноўныя асаблівасці.

Целасклад і паводзіны: маюць разцы, якія ўвесь час растуць, шчыльны целасклад і большасць відаў жыве ў норах. У адрозненне ад зайцоў, трусы нараджаюцца сляпымі і голымі, а зайцы - відушчымі і апушанымі.

Размнажэнне: цяжарнасць доўжыцца каля 28-35 дзён; у адным прыплодзе звычайна бывае ад 4 да 12 дзіцянятаў.

Выхаванне маладых трусоў. Калі маладыя трусы дасягаюць адпаведнага ўзросту, яны пачынаюць цікавіцца сваім асяроддзем і выяўляць сваю гуллівую натуру. Важна падаць ім бяспечную прастору для даследаванняў і гульняў. Таксама рэкамендуецца паступова прывучаць іх да рук і сацыялізаваць з людзьмі, каб яны сталі даверлівымі і прыязнымі гадаванцамі.

Здароўе і прафілактыка хвароб. Рэгулярныя наведванні ветэрынара і вакцынацыі з'яўляюцца важнымі аспектамі клопату пра здароўе труса. Ветэрынар правядзе агляд, праверыць зубы, кіпцюры і дасць рэкамендацыі па правільным сілкаванні і догляду. Трусы таксама могуць падвяргацца ўздзеянню паразітаў, таму важна рэгулярна апрацоўваць іх ад блох і глістоў.

Працягласць жыцця: свойскія трусы ў сярэднім жывуць каля 8-10 гадоў (часам даўжэй).

Пароды і ўжыванне.

Пароды дзеляць на дэкаратыўныя, мясныя, футравыя і мяса-шкуркавыя, а таксама па памеры - ад карлікавых (часта да 1-2 кг) да буйных (ад 4-5 кг і вышэй).

Утрыманне і сілкаванне.

Аснова рацыёну: сена павінна быць даступна ўвесь час, дапаўняецца дазволенай зелянінай, гароднінай ва ўмераных колькасцях і адмысловай вадой.

Умовы: патрабуецца прасторнае ўтрыманне без скразнякоў і перагрэву, рэгулярная ўборка, сточванне зубоў і прафілактычны агляд у ветэрынара.

Трусы і дзеці. Трусы могуць быць выдатнымі сябрамі для дзяцей, але ў гэтым выпадку неабходна назіранне і сталы кантроль дарослых. Дзеці павінны быць навучаны правільнаму абыходжанню з трусамі, а таксама быць асцярожнымі, акуратнымі і далікатнымі, каб не прычыніць ім шкоды.

Пароды трусоў



Аляска

Гэтыя трусы мяса-шкуркавага кірунку маюць сярэднія памеры, чорнае глянцавае футра з цёмным падшэрсткам. Радзімай пароды з'яўляецца Германія, дзе яе вывелі.



Ангорскі

Ангорскі трус - група парод, якія гадуюцца дзеля атрымання пуху. Атрыманы матэрыял выкарыстоўваюць для вытворчасці знакамітай ангорскай тканіны.



Баран

Даволі вялікія дэкаратыўныя трусы разнастайнай афарбоўкі з унікальнымі доўгімі вушамі. Парода вядзе сваё паходжанне з Англіі, дзе займаліся яе мэтанакіраванай селекцыяй.



Белая пухавая
Гэта айчынная парода пухавых трусоў мае сярэдні памер і чыста-белую афарбоўку. Выведзена пераважна метадам паглынальнага скрыжавання мясцовых малапрадуктыўных відаў.



Белы велікан
Каб разводзіць прадстаўнікоў пароды Белы велікан, не трэба валодаць адмысловымі навыкамі. Яны досыць непераборлівыя і не патрабуюць адмысловых умоў.



Белы Панон
Трусоў Белы Панон адносяць да мясной пароды і бройлернага віду. Дзякуючы адмысловаму адбору для скрыжавання, гэты гібрыд упершыню быў створаны ў Венгрыі.



Бельгійскі заяц
Дзіўная парода хатняга труса, атрыманая шляхам накіраванай селекцыі пагалоўя дзікага труса. Яны нават вонкава падобныя.



Бургундскі
Бургундскія трусы - гэта прадстаўнікі мясной пароды з высокай пладавітасцю. Жывёлы падыходзяць для гадоўлі, часта становяцца хатнімі ўлюбёнцамі.



Венскі блакітны
Венскія блакітныя трусы адрозніваюцца вонкавай прыгажосцю, колерам поўсці, які ўшанаваны ў іх назве, і выдатным выхадам пажыўнога мяса.



.Гермялін
Назва мае польскія карані. Першапачаткова гермяліны сталі вынікам скрыжавання дзікіх трусоў, галандскіх чыста белай афарбоўкі і невялікіх срэбных.



Каліфарнійскія
Каліфарнійскія трусы - прыгожая і непераборлівая парода. Іх гадоўля дазваляе пабудаваць прыбытковы бізнэс. Жывёлы выдатна прыстасоўваюцца да новых умоў.



Карлікавы баран
Аблавухіх трусоў, мыскі якіх вонкава нагадваюць маленькіх двухвушнікаў, у сваіх працах апісваў яшчэ натураліст Чарльз Дарвін.
(Працяг у наступным нумары.)



№ 30 (239) 25 ЛІСТАПАДА 2026 г.
наша СЛОВА .pdf

Згукі Дня беларускага пісьменства ў Лідзе

Ежы Путрамант

ВЕРАСЕНЬ*

Аповесць

Том першы

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

Той першы раз у Беластоку. Пасля той вялікай, пампезнай моладзевай справы, дзе ён упершыню закрычаў: "Камедыя скончана". У турме ім, яшчэ жоўтадзюбым, сказалі:

- Вальчак тут, сядзіць у дванаццатай.

Вядома, ён чуў пра Вальчака, але ў іх групе быў хтосьці, каму трэба было тлумачыць. Знакамітая Люблінская справа, на світанку гэтай мяшчанскай незалежнасці, рабочая міліцыя, якой першымі спалохаліся ППСныя міністры Пілсудскага. Манеўры, каб пазбавіцца ад яе каменданта і як мага цішэй раззброіць. Потым спробы выслаць яго за мяжу, каб выдаліць з краю. Няўдачныя. І, нарэшце, адкрытая бойка з непакорлівым люблінскім слесарам, які занадта літаральна паверыў у народны характар і справядлівасць гэтай Рэчы Паспалітай, не паддаўся абяцанкам, не паквапіўся на міністэрскую кар'еру, якую яму неаднаразова прапаноўвалі, упёрся і заставаўся з люблінскімі рабочымі. Дык вось, яго падставілі правакацыяй і асудзілі, а праз некалькі месяцаў супраць яго завялі дзве справы. Знакамітае версальскае правасуддзе: за адно і тое ж абвінавачванне, заснаванае на правакацыі, яго судзілі двойчы, асудзілі двойчы. На другой расправе дадалі яшчэ адно абвінавачванне - за прыналежнасць. Шэсць гадоў за першае, чатыры за другое. І не аб'ядналі тэрмін, да шасці гадоў толькі два мусілі быць дададзеныя. Першыя дзесяць гадоў, першыя дзесяць гадоў Польшчы, за якую змагаўся непаслухмяны, упарты слесар, ён сядзеў у турме.

За якую ён змагаўся. І быў жа нават у легіёнах. Ён змагаўся з царызмам недзе на Валынскіх раўнінах, сышоў, калі яму загадалі прысягнуць іншаму імператару. І гэты іншы зладзіў яму баявое хрышчэнне як баявому рэвалюцыянеру. Фельдпаліцыя злавіла яго на распаўсюджванні ўлётак і двойчы жорстка скатавала. Гэта мінулае, якое іншым забяспечыла дваццаць гадоў гонару, абрастання тлушчам і ўзняцця на вяршыню на спінах тых, хто быў ніжэйшы за іх, гэтае мінулае, якое і з найвялікшай лютасцю ППС-аўцы, яго былыя таварышы нагадвалі яму кулакамі ў дэфензівах, судовымі прысудамі і пазарэгламентнай турэмнай жорсткасцю.

Колькі гадоў Вальчаку ўдалося нармальна пражыць у гэтай мілай Польшчы Войткаў-Маліноўскіх і Косткаў-Бярнацкіх? Нармальна - гэта значыць, па левых паперах, хаваючыся ад дазорцаў, пазбягаючы дзённых прагулак, ніколі не затрымліваючыся ў адным горадзе больш за некалькі месяцаў. У 29-м ён выйшаў, а ў 32-м быў гэты правал. Не, напэўна, у 33-м.

І зноў справа без якіх-небудзь доказаў. Дзесяць гадоў. Шэсць гадоў прайшло. Дваццаць гадоў налічвала гэтая дзяржавы, з якіх шаснаццаць Уладак Вальчак правёў у турме.

Кальвэ не ўздыхнуў і не сціснуў кулакі. Магчыма, у яго галаве ўзнікла трохі халоднай іроніі пры думцы пра інтэлігенцыю - ліберaлаў, якія балбаталі пра “сваю” мяшчанскую свабоду, - тых, каго б ударыць вальчакавай гісторыяй па лапах, - калі б можна было верыць у іх наіўнасць. Давярайце тканіне, з якой былі сатканы іх характары.

Світанак дагнаў іх недзе пад Познанню. На станцыях стаянкі зноў падоўжыліся, туман засланяў чырвоныя вагоны, з якіх вытыркаліся морды коней, раздутыя ноздры, доўгія жоўтыя зубы, ржанне, па рэйках цягнуўся ездавы з вядром вады. Нацыянальная польская зброя, кавалерыя. Няўжо яны сапраўды вераць, што чагосьці вартыя? Сапраўды ўпадніцкі клас, падобны да старога, які губляе здольнасць адрозніваць важнае ад дробязнага. Вазьміце французскую шляхту XVIII стагоддзя ці Распуціна...

Але, мабыць, ён задрамаў, бо потым была раніца, сонца за кратамі злева. "Мы праехалі Познань, едзем на поўдзень", - машынальна канстатаваў ён. Паліцыянт спаў выцягнуўшыся, хроп, аж яго сівыя вусы падрыгвалі. Іншыя таксама спалі: нездарова атлусцелы Сасноўскі, сівуткі, сухі, заядлы Крыгер з іранічнай грымасай, якую

* Jerzy Putrament. Wrzesien. Ежы Путрамант. Верасень. Аповесць у двух тамах. Выдавецтва Міністэрства нацыянальнай абароны, Варшава, 1953 г. Першае масавае выданне. Тыраж: 75 000 асобнікаў. Пераклад Станіслава Судніка.



не сумеў сцерці нават сон, невысокі, старэйшы, таксама з вусамі, Казько з Люблінскага ваяводства, тая група з Заглембя, той тэкстыльшчык - напэўна, сухотнік - з запалымі шчокамі і тонкімі вуснамі. Толькі Вальчак, напэўна, чакаў, пакуль Кальвэ прачнецца, бо адразу ж усміхнуўся.

- Ну, як,- прашаптаў ён, - пачнем парадак дня?

Кальвэ, ужо прытомны, паглядзеў на яго. Гэтае суседства дапамагала яму зрабіць скачок са сну, нават ніякага, у гэты турэмны вагон. Вальчак заўсёды імпанаваў яму, і адной з прычын, магчыма, галоўнай, быў яго даволі гаспадарскі падыход да людзей і з'яў, строгае, але клапатлівае стаўленне Вальчака да ўсяго, што яго атачала. Было такое адчуванне, што турэмная камера, у якой ён правёў амаль палову свайго жыцця, была не камерай, а капітанскім мосцікам, толькі што матросы аглухлі і не чулі загадаў, якія ім кідалі. З нечаканым для сябе рэфлексам ён дакрануўся да рукі таго:

- Які першы пункт?

- Пра міжнародную сітуацыю дакладвае таварыш Кальвэ.

- У такім разе, пункт другі: задачы польскага працоўнага класа і польскіх камуністаў у дадзены момант, - дакладвае таварыш Вальчак.

Вальчак нешта яму сказаў. Ціха, каб не разбудзіць стражніка, яны абмяркоўвалі заблытаную для іх, адрэзаных ад прэсы, ад сваіх таварышаў на волі, сітуацыю. Што павінен быў рабіць польскі камуніст перад тварам нарастаючай гітлераўскай агрэсіі супраць Польшчы Бека і Сміглага-Рыдза? Справа здавалася зразумелай, але столькі другасных ускладненняў.

Павольна прачыналіся і іншыя. Кашаль тэкстыльшчыка нарэшце разбудзіў самых сонных. Хлопец з Заглемба, з якім ён быў у кайданках, свабоднай рукой працягнуў яму бляшаны кубак вады. Паліцыянт пацягнуўся ногі ў куце і прамармытаў нешта пра свае старыя косці і нязручныя турэмныя лаўкі. Яго скаргі прыцішылі дыскусію. Вальчак глядзеў у акно:

- Добрая зямля ў гэтым Познанскім ваяводстве. Горшая, чым у нас, у Люблінскім, але апрацоўваецца больш старанна.

- Кулацкія гаспадаркі, - сказаў ён, - Козько. - Тут з парабка выціскаюць апошні сок.

- Гэта свая дарога, але варта было б у іх павучыцца сельскагаспадарчай культуры. На здаровай, механізаванай аснове, вядома.

Некалькі з іх, вядома ж, на чале з Крыгерам, разгаварыліся на сялянскія і вясковыя тэмы. Дзень павольна нараваў сцены вагона, жоўты сонечны прамень на падлозе дрыжаў, пераскокваючы з нагі на нагу на тых, хто там сядзеў. Яны прыехалі ў Казяборы ўжо апоўдні.

Парамі, у кайданках, іх пашыхтавалі на пероне. Паліцыянты з карабінамі на пасах, як аўчаркі, атачылі іх, і яны рушылі. Мястэчка было даволі мізэрнае, фабрычкі на прадмесці і трохі раззявак на тратуарах.

Такія транспарты не былі чымсьці новым у Казяборах, але жыхары, мабыць, пра нешта задумваліся. Чым даўжэй яны ішлі, тым больш было гледачоў, здзіўленых твараў, нават пытанняў.

- Палітычныя, - сказаў нехта спераду.

Гэтае выказванне ўзрушыла гледачоў. Перад Кальвэ жанчына ўсунула пачак цыгарэт у руку хлопцу з Заглемба.

- Так, камуністы! - Вальчак, падняўшы галаву, падхапіў нечы шэпт з тратуара.

- Рабочы клас Польшчы!

- Не размаўляць! - закрычалі канваіры, а тутэйшыя гранатовыя, якія аднекуль высыпаліся, пачалі разганяць раззявак.

У турэмным двары трэба было чакаць. Двор быў малюсенькі, з трох бакоў акружаны турэмнымі крыламі. Сцены былі прарэзаны радамі вокнаў, кожнае з якіх было прычынена цяжкім драўляным вечкам. У канцылярыі паспешліва запаўняліся карткі, і мясцовыя ахоўнікі былі раз'юшаныя нечаканым прыходам такога натоўпу. З іх знялі кайданкі. Вальчак і Кальвэ трапілі ў канцылярыю сярод першых з тых, хто прыбыў у офіс. Тут, аднак, ім давялося чакаць.

Вальчак, зрэшты, адчуваў сябе, як дома. Неўзабаве ён ціха размаўляў з варшаўскім кіроўцам трамвая, які спытаў яго, ці варта наймаць адваката Залескага ў якасці свайго абаронцы.

- Санатар, - пакруціў ён галавой. - Ён не любіць брацца за камуністычныя справы, а калі і бярэ, то здзярэ шмат грошай...

- Ён абараняў мяне пяць гадоў таму вельмі прыстойна...

- Ён за апошнія пяць гадоў паттлусцеў. Мне нядаўна пра яго расказвалі. Не раю...

- Не размаўляць! - падскочыў да іх з грозным выразам твару моцна сівы ахоўнік.

- Пане! - Вальчак не хваляваўся: - Я вас ужо недзе бачыў. Колькі гадоў вы ў гэтай прафесіі?

- Можа, з трыццаць. А што? - выбухнуў ахоўнік.

- Ого. - Вальчак спачувальна кіўнуў: - Трыццаць гадоў у турме, удвая даўжэй, чым я.

Стражнік глядзеў, не ведаючы, ці злавацца яму на гэтую фамільярнасць, ці ўздыхнуць і падумаць пра сваё жыццё, якое сапраўды прайшло за кратамі. Ён няўпэўнена адышоў, быццам упершыню ўсвядоміўшы гэтую праўду.

Яны выйшлі на двор. Хлопец з Заглемба прапанаваў ім пачак "Клубаў", які атрымаў на вуліцы, і яны закурылі. Праз канцылярыю наплывалі новыя групы. Вальчак нахіліўся да Кальвэ:

- Чаго мы чакаем? Зараз тут!

- Добра. Пачынай.

- Таварышы! - ускочыў Вальчак. - Перад тварам пагрозы нямецкага фашызму Польшчы мы, польскія камуністы, заяўляем аб гатоўнасці абараняць краіну са зброяй у руках.

У вузкім двары было каля двухсот чалавек. Голас

тут дуднеў, як у дрэнным тэатры. Вальчак не шкадаваў свайго голасу. Над дошкамі заслонаў, у вузкіх аконных праёмах, ён бачыў ілбы і вочы тых, да каго яны прыехалі. Ён звяртаўся да іх таксама, і не толькі да іх. Яму хацелася крычаць так гучна, каб тыя, хто ў Казяборах, на вуліцах, на фабрыках, пачулі яго словы і паўтарылі іх па ўсёй Польшчы.

- Таварышы! Мы не згодныя з рэжымам Бека і Рыдза-Сміглага. Гэты рэжым прывёў Польшчу да краю бездані. Каб выратаваць яе, нам патрэбны шырокі фронт рабочых, сялян і інтэлігенцыі; нам патрэбны сапраўды дэмакратычны ўрад...

Яго досвед падказваў яму: у вас ёсць столькі часу, колькі трывае здзіўленне праціўніка. Таму ніякіх хітрасцяў, ніякіх адхіленняў ад тэмы. Толькі змест, голая, палітычная дэкларацыя. Вось яны, бягуць з канцылярыі:

- Ціха там, ціха, ніякіх прамоваў, карцар!

- ...Мы, хто першымі гінулі на фронце ў барацьбе з фашызмам, сёння заяўляем: дайце нам зброю; мы будзем змагацца і памром разам з вамі, абараняючы Польшчу!

Гэтыя словы запаволілі бег стражнікаў. Яны спыніліся, паўтарылі:

- Ніякіх мітынгаў тут, - але без пераканання, некаторыя з іх вярнуліся назад у канцылярыю.

Такім чынам, ёсць яшчэ пяць хвілін, пакуль не прыйдзе другі, катэгарычны загад: “Заткніце іх!”.

- Наша задача ў гэтыя гістарычныя дні, разам з усім польскім рабочым класам, - прыняць удзел у гэтай барацьбе!

Рэакцыя каменданта турмы была хутчэйшай, чым думаў Вальчак. Зараілася раптам ад цёмна-зялёных мундзіраў ахоўнікаў. Таварышы ўскочылі з брукаванкі і акружылі яго колам. Але адзін з брыгадзіраў, пузаты і румяны, сачыў за ім, як дзік, адштурхоўваючы вязняў убок, рваўся наперад.

- Няхай жыве Народная Польшча! - Вальчак усё яшчэ крычаў. - Біце Гітлера.

І цяжкая лапа стражніка апусцілася яму на плячо.

- У карцар, гэтага ў карцар! - раўнуў брыгадзір, адштурхоўваючы Вальчака назад, у абдымкі памочніка. - Астатніх, ніякіх размоў, забірайце іх у камеры!

- Але, проша пана! - вельмі спакойна сказаў Кальвэ: - Але ж ён заклікаў абараняць Польшчу ад гітлярызму!

- Не ваша справа! - прабурчаў брыгадзір. - Мы самі з гэтым справімся! Гэтага, ало, гэтага ў камеру! - крыкнуў ён стражнікам, з усёй сілы штурхнуў Кальвэ, потым расшпіліў каўнер і пачаў выціраць хусткай тоўсты, счырванелы карак.

8

- Дазволь, - сказаў Залескі, - дазволь, Ганна. Гэты тып цвіка забіваецца па-іншаму. Вось, глядзі, яго трэба трымаць тут за галоўку, біць не занадта моцна, але часта, трохі ўверх, разумееш? Інакш рызыкуеш разваліць тынк або сагнуць цвік. Вось, бачыш? Гатова, - ён пацёр рукі, гледзячы на яе, чакаючы пахвалы.

"Дзіўна, - падумала яна. - У рэшце рэшт, у яго ўвогуле выдатная памяць. У некаторых справах нават уражлівая. Ён можа за паўхвіліны пералічыць усе кантоны Швейцарыі, усе крыжовыя паходы, нават усіх амбасадараў і дэпутатаў у Варшаве. Але ён шчыра не памятае, што ўжо дэманстраваў гэты метад забівання цвікоў дзясятак разоў, кожны раз папярэджваючы аб адтуліне ў гіпсе.

Унутры яго была вечна такая напружаная струна, пастукванне па якой станавілася ўсё больш неабходным для нармальнага жыцця. Ганна помніць ягоны твар, які яшчэ некалькі гадоў таму разгладзіўся, зрабіўся прыстойным, нават шляхетным тады, калі нехта яго за нешта пахваліў. Расшыфраваць гэты механізм было няцяжка, і спачатку Ганна адразу карысталася ім даволі бесцырымонна. У моманты, калі ёй патрэбна было мець яго ў добрым гуморы, ёй дастаткова было сказаць з веданнем справы: ты бліскуча справіўся з гэтай справай. Ці нават: ты бліскуча згуляў у гэтай контратацы. Або: ты з густам падабраў гальштук да кашулі. Або: у цябе выдатныя біцапсы.

Нават такі мала ад яго залежны факцік, як сказаць: у цябе дзіўныя вочы, на левым ёсць жаўтаватая пляма, а правае блакітнае - калі гэта добра сказана, гэта можа мець жаданы эфект. Твар Віктара святлеў і ён у соты раз казаў: “Ты гэта заўважыла? Так, як гэта дзіўна?” Ён бег да люстэрка, рассоўваў пальцамі павекі, таропіўся ў свае рознакаляровыя вочы, клікаў яе і дзяліўся ўражаннямі. Ён быў рацыяналістам, не рабіў з гэтага ніякіх высноў, акрамя спасылкі на закон Мендэля, ён толькі патрабаваў, каб яна захаплялася не толькі яго вачыма, але і яго веданнем генетыкі.

З часам яна стамілася ад аднаго і таго ж рытуалу зноў і зноў. Яна стала менш клапаціцца пра яго добры настрой. Не патрапляла ў тугую струну. Потым рэакцыя Віктара паступова змянілася. Як наркотык, які спачатку прыносіць асалоду, недахоп якога з часам ператвараецца ў пакуту, Віктар усё часцей ствараў сітуацыі, якія патрабавалі яе пахвалы, і твар яго мяняўся, адчуваўся, напэўна, боль, нават фізічны, калі яна рабіла выгляд, што не заўважае гэтага.

Так набліжалася трэцяя стадыя: калі, не пачуўшы гуку струны, якую ён настроіў так, што яна ледзьве магла зачапіцца, пачынаў: “Праўда? Цікава, што? Што ты думаеш? Я меў рацыю, ці не так?”

Але ён не быў ні дурным, ні няўдачлівым. Гэта не жыццёвыя няўдачы абвастрылі яго пяшчоту да сябе. Можа, проста яны былі больш маруднымі, гэтыя поспехі, і не такімі шматлікімі, не такімі важнымі, як яму хацелася б. У свае трыццаць з нечым, ён меў сваю адвакацкую канцылярыю, зарабляў даволі прыстойна, быў здаровы і даволі спартыўны. Яны не адмаўлялі сабе ні ў якіх так званых забавах, разам з некалькімі тысячамі сталічных вяршкоў зведвалі штогод патрэбу блукаць, як вугры ці ласось; у лютым - у Закапанэ, у жніўні - у Юрату ці на Ястрабіную Гару.

(Працяг у наступным нумары.)

Леанід Лаўрэш

